СЛУЦКАЕ ПАЎСТАННЕ

I. “Крымінальная гісторыя”

За гады савецкай улады гісторыя Слуцкага паўстання абрасла ідэалагічна-тэндэнцыйнымі ацэнкамі і крымінальнымі штампамі. Тэма была засакрэчана на доўгія гады і схавана ў спецсховішчах. Гісторыя шырокага народнага ўздыму супраць савецкай улады ніяк не спалучалася з казкамі партыйнага афіцыёзу аб агульным замілаванні і ўсеабдымнай радасці, якую быццам бы выклікала ўсталяванне бальшавіцкага рэжыму ў Беларусі. Па сутнасці, гісторыя паўстання засталася на старонках крымінальных спраў, сабрана і запісана следчымі і былымі ўдзельнікамі, кіраўнікамі і шараговымі. Як ні дзіўна, не ўсё сцёрта і з народнай памяці.

У пачатку 90-х гадоў у Інстытут гісторыі Акадэміі навук прыйшла жанчына сталага ўзросту, вельмі стомленая, але не зломленая жыццём. Ірына Аляксандраўна Маркевіч, даведаўшыся, што антысавецкая сялянская партызанка - ўжо прадмет даследавання, прасіла дапамагчы знайсці звесткі пра яе бацьку, удзельніка Слуцкага паўстання. Толькі за тое, што Аляксандр Маркевіч тры снежаньскія тыдні 1920 года праслужыў каптэрнамусам у Слуцкім палку, а потым прайшоў курс падрыхтоўкі ў вайсковай школе Лодзі і меў намер стаць афіцэрам арміі незалежнай БНР, ён сам, яго бацькі, жонка, дзеці, шматлікія сваякі, нават стрыечныя былі знішчаны ў ГУЛАГУ.

Аляксандр Маркевіч быў асуджаны ў 1929 годзе на тры гады высылкі на Салаўкі, але дамоў не вярнуўся, а дачка і цяпер не ведае, дзе ён знайшоў апошні прытулак. Не вярнуліся і яго “падзельшчыкі” па крымінальнай справе, 14 чалавек былых навучэнцаў слуцкай гімназіі і семінарыі, а потым курсантаў, як А.Маркевіч, вайсковых школ Лодзі і Варшавы, што марылі насіць пагоны беларускага афіцэра з выяваю Пагоні. Як ні намагаліся даследчыкі, але нават слядоў былога каптэрнамуса Слуцкага палка не знайшлі. Аднак крымінальная справа А.Маркевіча і яго сяброў і паплечнікаў - Ф.Арцыховіча, А.Бараноўскага, М.Міхайлоўскага і іншых - дала выразную карціну шырокага ўдзелу слуцкай моладзі ў тых падзеях. Узрост, паходжанне, адукацыйны ўзровень, палітычныя перакананні згаданых случакоў адлюстроўвае крымінальная справа .

А куды яны зніклі? На гэты конт ёсць вусная версія, якая прагучала падчас размовы з дачкой ўдзельніка гістарычнай падзеі, так званай лістападаўскай справы, Нічыпара Мяцельскага - Алены Нічыпараўны. З мясцечка Пясочнае (былы Слуцкі павет), дзе жылі яе сваякі, аднаму

хлопцу пашчасціла выйсці ў лётчыкі, і ў 30-я гады ён перавозіў грузы на Салаўкі, дзе і перажыў выпадак, што не мог забыць ўсё жыццё. На востраве пасля прызямлення яго самалет адразу абступіў натоўп. Пакуль лётчык здзіўлена разглядаў абарваных, здзічэлых людзей, тыя схапілі, разадралі на кавалкі і з’елі яго чацвераногага сябра - сабачку-дварняка, які выкаціўся ўслед за гаспадаром з самалёта і меў намер павітаць людзей брэхам. Не паспеў лётчык прыйсці ў сябе, як з натоўпу да яго наблізіўся шкілет. “Я цябе пазнаў, - загаварыў цень чалавека, - ты пясочны хлопец, я тваіх бацькоў ведаю”. Ён назваў сябе і мясцовасць, дзе раней гаспадарыў. Усё, што было з сабою, да апошняга кавалка хлеба раздаў землякам лётчык, а калі прыехаў дамоў, не ўстрымаўся, расказаў пра гаротнікаў сваякам.

Слуцкая гісторыя складаецца з асобных маленькіх гісторый, аповядаў пра людскія лёсы. Іх тысячы, дзесяткі тысяч, адна за адну чапляюцца, пераплятаюцца, ствараючы агульную, ў асноўным з “успамінаў”, што пакінулі вязні ЧК-ОГПУ-НКВД у розныя гады. Арыштоўваць случакоў пачалі адразу, з вясны 1921 года, як вярталіся дамоў з польскіх лагераў для інтэрнаваных. Судзілі за незаконны пераход мяжы. Вялікіх тэрмінаў зняволення ўлада не давала, абмяжоўвалася штрафамі. Не хапіла б турмаў, каб забяспечыць месцамі усіх, хто вярнуўся. Можна ўявіць сабе гэтую колькасць люду, калі ў паўстанні прынялі ўдзел амаль усе вясковыя дарослыя мужчыны, асабліва моладзь. Аб гэтым сведчаць спісы ўдзельнікаў паўстання з вёсак Сарагі, Востраў-Боркі, Шышчыцы, Ленькі, Машчыцы і г.д. З вёскі Шышчыцы, напрыклад, толькі адзін з мужчынскай грамады трапіў у Чырвоную армію, астатнія 72 дэзерціравалі і запісаліся добраахвотнікамі ў Брыгаду БНР на чале з капітанам Анупрэем Няронскім (пазней ён зойме пасаду начальніка гаспадаркі Брыгады). Яны папоўнілі ў Семежава Слуцкі полк. Аб гэтым факце Няронскі паведаміць пад час арышту ў 1932 годзе.

У ліпені 1921 года ў Слуцку судзілі беларускіх эсэраў, арганізатараў паўстання. У спецсховішчах Масквы захоўваецца 167 тамоў гэтай справы. Увосень 1921 года - яшчэ адзін працэс у Слуцку. Падрабязнасці не вядомыя, бо не было доступу да дакументаў. Па працэсу праходзілі эсэры Рыгор Буддавей, Васіль Цімкевіч, Уладзімір Грушэўскі, сёстры Людміла і Марыя Стагановіч, сябры першаснай ячэйкі Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў у вёсцы Старыца.

І далей пакацілася кола рэпрэсій. Гучны працэс адбыўся ў снежні 1925 года. Савецкая ўлада судзіла камандзіра Слуцкага палка Ахрэма

Гаўрыловіча, лётчыка Сяргеенку і ўжо згаданага А.Маркевіча (гэта была яго першая судзімасць). У лютым наступнага 1926 года прагрымеў лістападаўскі працэс. Улада распачала сапраўднае паляванне на былых удзельнікаў антысавецкага руху. Розгалас у прэсе меў на мэце распаўсюдзіць пагрозу і запалохаць людзей. У 1928 годзе - арышты былых курсантаў вайсковых школ, так званых “балахоўскіх”. Кіраўнікі паўстання Павел Жаўрыд і Уладзімір Пракулевіч будуць даваць паказанні об слуцкіх падзеях у 1930-м годзе падчас сумна вядомага працэса “СВБ” - “Саюза вызвалення Беларусі”. Чаму ў гэтым выпадку ўлада так спазнілася з арыштам? Таму, што вяла беларускія гульні, рабіла выгляд, што дарue грахі беларускім палітыкам, выманьвала з-за мяжы. Але пройдзе яшчэ дзесяць год, і літасці не будзе нікому.

Так званы “БНЦ” - “Беларускі нацыянальны цэнтр” - энквэдысты прыдумаюць у 1934 годзе. Гэта была расправа над дзеячамі, што нейкі час пасля Слуцкага паўстання рабілі беларускую палітыку ў Празе і іншых замежных цэнтрах. Іх таксама ўлады змаглі выманіць, каб знішчыць.

Апошніх случакоў, хто яшчэ захаваўся ў цывільным жыцці, ГУЛАГ падбіраў ў 37, 38, 39-м. Найбольш жорсткая расправа напаткала Марка Асвяцімскага, старшыню Слуцкай арганізацыі БПС-Р і яе сакратара Андрэя Бараноўскага - растрэл. Вядомага случака Сяргея Бусла і Янку Пешку (ён жа зялёнадубец Густалес), схапілі адразу, як толькі Чырвоная армія ў верасні 1939 года ўвайшла ў Вільню. Так спяшаліся, што пратакол затрымання аформілі толькі праз месяц, сабраўшы ўсіх сваіх ахвяр у Вілейскай вязніцы. Сам Лаўрэнцій Цанава сачыў за аперацыяй захопу.

Усе случакі, якія вярнуўся на Беларусь добраахвотна ці прымусова, прайшлі праз ГУЛАГ. Удзелу ў Слуцкім паўстанні - гэтага “граха маладосці” - савецкая ўлада не даравала.

Такім чынам, крымінальныя справы случакоў - адна з найбольш грунтоўных і багатых на факты крыніц. Частка матэрыялаў ужо надрукавана з каментарамі даследчыкаў, вельмі неабходных для гэтых дастаткова спецыфічных матэрыялаў.

II. Чаму менавіта ў Слуцку?

Слуцк - адметны горад з трывалымі культурнымі традыцыямі. Случчына - край заможных людзей, жытніца Міншчыны. За гады няспыннай вайны яна карміла шмат армій: расійскую, нямецкую, польскую, зноў расійскую і г.д. Але голаду не зведала. Першую сусветную вайну слуцкія гаспадары вытрымалі, пахіснуліся толькі ў першыя гады бальшавіцкага ўладарання. Страты ад першых камуністычных эксперыментаў і палітыкі ўсеагульнага рабаўніцтва былі непараўнальныя з ваеннымі.

Становішча павета было вельмі складаным. Магутныя суседкі Беларусі - Расія і Польшча - шляхам вайны высвятлялі адносіны. Пасля разгрому савецкіх войскаў пад Варшавай ў жніўні 1920 года Чырвоная армія пачала адступать на ўсход, аддаючы польскім войскам тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. У Рызе ішлі мірныя перамовы паміж урадавымі дэлегацыямі Савецкай Расіі і Савецкай Украіны з аднаго боку і Польшчы - з другога. Беларусаў, нават прадстаўніка БССР А.Чарвякова ў Рыгу не дапусцілі, нягледзячы на вялікую хвалю народнага абурэння, што пракацілася па беларускай зямлі. Расія была гатова, калі спатрэбіцца, перадаць усю тэрыторыю Беларусі Польшчы. Але польскі бок быў не ў стане прыняць такую “ахвяру”, каб не стварыць сабе “беларускай праблемы” (1).

12 кастрычніка 1920 года быў падпісаны дагавор аб замірэнні і прэлімінарных умовах міру. Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна адыходзілі да Польшчы. Тым не менш, начальнік Польскай дзяржавы і галоўнакамандуючы Ю.Пілсудскі аддаў загад сваім войскам перасоўвацца далей і пасля замірэння. 15 кастрычніка быў заняты Мінск, але паводле ўмоў пагаднення 17 кастрычніка польскія войскі пакінулі горад. Баі з чырвонымі з пераменным поспехам вяліся да 18 кастрычніка. Чырвоныя былі адкінутыя за 25 вёрст на ўсход ад Слуцка (2).

Час знаходжання на гэтым абшары польскіх аддзелаў імкнуліся выкарыстаць беларускія незалежніцкія партыі і арганізацыі. Галоўнай іх мэтай было ўтварэнне палітычнага прадстаўніцтва беларускага народа і фарміраванне ўласных збройных сілаў. Кіраўніцтва польскай 4-й арміі, аддзелы якой знаходзіліся ў Слуцкім павеце, не перашкаджалі гэтаму палітычнаму працэсу.

Арыштаваны ў 1930 годзе Уладзімір Пракулевіч пакінуў у ДПУ своеасаблівы нарыс “Слуцкае паўстанне (лістапад-снежань 1920 года)”,

даволі падрабязнае апавяданне аб падзеях. “В городе замерла вся жизнь, глубокая тишина господствовала на улицах, - успамінаў ён тыя кастрычніцкія дні, - общественные и государственные организации не функционируют, приостановилась и торговая деятельность. Город обезлюдел”. Але, як сведчыў Пракулевіч, разгубленасць хутка прайшла. Аднавілася дзейнасць Нацыянальнага камітэта, які ў перамовах з прадстаўнікам польскай улады ў Слуцку, камандзірам 11-й дывізіі палкоўнікам Ясінскім высветліў, што лёс павета канчаткова не вырашаны, ад случакоў чакаюць “просьбы” аб далучэнні да Польшчы. Палякі распаўсюджвалі падрыхтаваныя “ухвалы” з наступным тэкстам: “Мы, жыхары (назва вёскі і воласці), прызнаём за нашу родную маці Польшчу і просім Польшчу прыняць нас ва ўлонне сваё”. Нахабнае распаўсюджванне паланафільскіх улётак выклікала актыўны пратэст і супрацьдзеянні Нацыянальнага камітэта Случчыны, “ухвалы” стараліся перахапіць. Польскіх агентаў затрымлівала беларуская міліцыя. У адказ іх арыштоўвала польская ўлада. На хадайніцтва камітэта аб іх вызваленні жандары адказвалі: “Кульку ім у лэб”. Тым не менш, адчуваючы падтрымку большасці насельніцтва, якое зусім не жадала апынуцца пад польскім дахам, Нацыянальны камітэт настойліва даказваў незаконнасць гэтай агітацыі. Урэшце міліцыянераў адпусцілі.

Патрыятычная пастава мясцовага сялянства, няпэўнае становішча паміж двума варожымі бакамі, якія былі вельмі заняты вырашэннем асабістых праблем, падштурхоўвалі да пошукаў самастойнага палітычнага шляху.

Безумоўна, прыхільнікі незалежнасці Беларусі ў першую чаргу ўлічвалі нявызначанасць палітычнай сітуацыі ў Еўропе. Беларускае пытанне толькі пачало абмяркоўвацца ў пэўных колах Антанты, і ўзброеная барацьба за незалежнасць павінна была паўплываць на яго рашэнне, тым больш і першы пункт Рыжскай дамовы фармальна сведчыў аб прызнанні расійскім і польскім бакамі суверэнітэту Беларусі. Беларуская грамадскасць спадзявалася, што яе незадаволенасць гвалтоўным падзелам Беларусі на дзве часткі будзе пачутая і выклікае паразуменне. Быў пэўны разлік на слабасць саветаў. Армія Врангеля яшчэ вяла баі, рыхтавалі сілы Булак-Балаховіч, Пятлюра, Пермыкін. Гэта ваеннае супрацьстаянне на думку пэўных палітычных колаў можна было ўжыць на сваю карысць.

І амаль галоўная прычына хавалася ў тым, што вёска выспела для актыўнага ўзбройнага пратэсту. Простыя людзі прыйшлі да высновы,

што паратунку ад хаосу, зневажання, рабунку трэба шукаць у самастойнай незалежнай дзяржаве з уласным войскам і ўрадам. Дэлегаты з месцаў, што сабраліся на з'езд напярэдадні паўстання, разважалі, маўляў, не трэба вялікіх палітыкаў Віттэ і Сталыпіных. Беларусь - краіна невялікая і людзі самі ў стане ўправіцца. А калі трэба плаціць падаткі, то лепш свайму ўраду і свайму войску... (3). "Сяляне ўсе, як адзін, выказаліся, што час настаў падняць сцяг змагання за незалежнасць Бацькаўшчыны", - пісаў у сваіх "Успамінах Слуцкага паўстанца" удзельнік з'езду Сяргей Бусел (4). "Националистические настроения населения были достаточно сильны, можно было рассчитывать на успех", - сведчыў на допыце Уладзімір Пракулевіч. Сярод іншых прычын ён зазначыў: незадаволенасць сялянства харчразвёрсткай і шматлікімі рэквізіцыямі, нежаданне служыць у Чырвонай арміі (5). Лозунгі, з якімі яна крочыла на Захад - "Да здравствует мировая революция! Да здравствует Советская власть во всем мире! Да здравствует советская Польша!" - не натхнялі мясцовае насельніцтва (6). Дэзерцірства з Чырвонай арміі мела каласальныя памеры. Гэта была адна з вельмі распаўсюджаных формаў супраціўлення новай уладзе. У.Пракулевіч пісаў, успамінаючы восень 1920 года: "громадное скопище дезертиров Красной Армии, частью вооруженных, целыми отрядами приходили в свои родные места... активно выражали антисоветские настроения" (7). Высвятляе пытанне прычын слуцкіх падзей яшчэ адно красамоўнае сведчанне, якое ў архіве КДБ пакінуў вязень Салавецкага лагера, а да гэтага - удзельнік Слуцкага паўстання, курсант Лодзінскай вайсковай школы (так званай балахоўскай) Аляксандр Бараноўскі: "Сведения о расстрелах практически всех, кто достиг мобилизационного возраста и не служил в Красной Армии, о закрытии учебных учреждений, о зверствах над населением, об ограблениях и гвалте приняли колоссальные размеры... Население не верило в возможность обновления польской власти да и не хотело её, а советская власть... была страшная"(8).

Добра памятала жахі мабілізацыі ў Чырвоную армію жыхарка вёскі Варкавічы, 97-гадовая Аўгіння Грыцкевіч (Мошка). Яна прывяла прыклады забойства маладых людзей пад час гвалтоўнага запісу ў чырвонае войска. "Накінуўшы пятлю на шыю, хлапчука цягнулі праз ганак і маглі задушыць", - успамінала тагачасную бяду равесніца стагоддзя (успаміны запісаны ў 1997г.) (9). Як бачым, страх, інстынкт самазахавання вымушалі пакідаць роднае гняздоўе, браць у рукі зброю. Маці заклікалі сыноў шукаць паратунку ад мабілізацыі ў

Чырвоную армію.

Слуцкае паўстанне - своеасаблівая кульмінацыя сялянскай антысавецкай вайны на Беларусі. На шляху нацыянальнага вызваленчага руху гэтая падзея была найбольш масавай, палітычна прадстаўнічай, найлепш арганізаванай у ланцугу ўзброенных і іншых акцый. Адчуванне сябе часткай маштабнага працэсу змагання за самастойнасць Беларусі падштурхоўвала да рашучых крокаў. Інфармацыя аб палітычны падзеях з месцаў паступала сваечасова. На другі дзень работы з'езда Случчыны перад дэлегатамі выступіў арганізатар слуцкай народнай міліцыі і паўстанцкіх аддзелаў паручнік Іван Мацелі. Заклікаючы да ўзброеннага супраціву, ён давёў да ведама прысутных аб шматлікіх паўстаннях супраць саветаў на Міншчыне. Як сведчаць архіўныя крыніцы, Мацелі гаварыў праўду. Так, 28 кастрычніка 1920 года (звярніце ўвагу на дату!) А.Чарвякову, які ў той час узначальваў рэўком Савецкай Беларусі, паступіла інфармацыя Барысаўскага камісара аб становішчы ў павеце : "Зелёная армия в Борисовском уезде разрослась до неимоверных размеров. Нет ни одной волости уезда, где не было бы банд. Особенно много их в некоторых волостях, где есть для них природные убежища... По слухам, по всему уезду имеется несколько тысяч бандитов. В настоящее время банды начали действовать открыто. Они напали на Гайна-Слободу и местечко Плещеницы, которое некоторое время находилось в руках бандитов" (10).

Як засведчыла тая ж крыніца, Барысаўскі павет ахапіла дэзерцірства. Шэрагі чырвоных пакінуў ўвесь кавалерыйскі атрад Барысаўскага ваенкамата, прыхапіўшы коней і зброю. З новастворанай у Барысаве савецкай міліцыі сышло 50% яе складу. Разбегліся ахоўнікі мясцовай турмы. "Банды мешают проведению всей политической работы и проведению продовольственной и аграрной политики советской власти". Захоп населеных пунктаў і арганізацыя часовай улады - з'ява ў той час вельмі распаўсюджаная.

Палітычна актыўнае насельніцтва Беларусі хвалявалася з прычыны несправядлівых перамоў у Рызе. На беспартыйнай канферэнцыі ў Халопенічах, як даносіў Чарвякову павятовы камісар, была прынята "резолюция, в которую внесены слова контрреволюционного пожелания: желаем мирным путем освободить Беларусь от польских и советских войск и дать ей возможность самоопределиться без чьей бы то ни было диктатуры". Літаральна, як ў случакоў: "ні з Польшчай, ні з Масквой" (11). Вельмі падобную

карціну малюе і даклад ад 15 лістапада 1920 года ў Ваенрэўкам БССР аб стане ў Мінскім павеце. “...Население некоторых волостей, узнав о самоопределении Беларуси, не хочет признавать никакой власти, кроме несуществующего (для камісара ўрад, вядома, не існаваў) правительства “незалежнай Беларусі” и относится очень враждебно к организуемым волостным ревкомам, заявляя, что власть нужно выбирать, а не назначать из Москвы” (12). У лістападзе пад бела-чырвона-белымі сцягамі паўсталі Пагарэльская і Якшыцкая воласці пад кіраўніцтвам ксяндза Варановіча.

Такім чынам, у восень 1920 года незалежніцкі настрой панаваў сярод значнай часткі насельніцтва Беларусі.

Крыніцы. Заўвагі

1. Грыцкевіч А. Слуцкае паўстанне 1920 г. - збройны чын у барацьбе за незалежнасць Беларусі //Спадчына, 1933. - № 2. - С.3.

2. Там жа.

3. Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа “СВБ”. Паказанні Ул.Пракулевіча. Цытаванне матэрыялаў Архіва КДБ на мове арыгінала.

4.БДА МЛіМ. Ф.3, воп.1, сп.56, а.157.

5. Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа “СВБ”. Паказанні Ул.Пракулевіча.

6. ДА Мінскай вобласці. Ф.2, воп.1, сп.9, а.4.

7. Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа “СВБ”. Паказанні Ул.Пракулевіча.

8.Там жа. Крымінальная справа Ф.Арціховіча і інш.

9. Асабісты архіў аўтара. Успаміны запісаны ў вёсцы Варкавічы Слуцкага раёна ў сакавіку 1997 г.

10.НА РБ. Ф.8, воп.1, сп.1, а.42. Цытуецца на мове арыгінала.

11.Там жа, а.81а.

12. Там жа.-

III. Слуцкая “Папараць-кветка”

Случчына мела каласальны нацыянальна-культурніцкі рэсурс. Менавіта ў Слуцку заквітнела цудоўная “Папараць-кветка”, грамадска-палітычная маладзёжная арганізацыя. Гэта вельмі характэрная рыса таго часу - утварэнне культурна-асветніцкіх, прыродазнаўчых, грамадска-палітычных гурткоў. Яны з’уляліся на высокай хвалі абуджанай нацыянальнай свядомасці. Моладзь адчула сваю нацыянальную прыналежнасць і распачала сапраўдную барацьбу за беларускасць.

“Беларускі гурток “Папараць-кветка” з’яўляецца падпораю ўсіх беларускіх арганізацый у Слуцку”, - адзначалі вядучую ролю арганізацыі ў нацыянальнай справе тагачасныя сродкі масавай інфармацыі (1). Слуцкая “Папараць-кветка” будзіла патрыятызм у маладых сэрцах.

Ініцыятарам яе ўтварэння быў Сяргей Бусел, здольны да навукі, жвавы хлопец, любімы вучань дырэктара слуцкай гімназіі Радаслава Астроўскага. Разам са старэйшым сябрам Фабіянам Шантырам і Янкам Ракуцько, вучнем слуцкай тэхнічнай школы, ён браўся аб’яднаць моладзь Случчыны для агульнай культурнай і нацыянальнай працы. Імпрэзы, што яны наладзілі, адразу сталі вельмі папулярнымі. На вечарынках гучала беларускае слова, беларускія песні. Сур’ёзна абмяркоўваліся літаратурныя творы. Ставілі спектаклі самі і запрашалі артыстаў з Мінска. Неаднаразова па запрашэнню “Папараць-кветкі” прыязджала ў Слуцк капэла Уладзіміра Тэраўскага, у складзе якой былі, як высветліцца з часам, будучыя паўстанцы і сябры “Зялёнага Дуба”. З лекцыямі аб адметнасці і самабытнасці беларускай гісторыі перад моладдзю выступалі вядомыя палітычныя і грамадскія дзеячы. Пачэснымі сябрамі “Папараць-кветкі” былі абраны вядомыя случакі, актыўныя эсэры Уладзімір Пракулевіч, Павел Жаўрыд, Марк Асвяцімскі, Андрэй Бараноўскі. Дарэчы, апошні ў 1919 годзе ўзначаліў “Папараць-кветку” і кіраваў ёю да вясны 1922 года, пакуль яна не была зліквідавана Слуцкім аддзелам народнай адукацыі як арганізацыя, варожая савецкай уладзе (2). Відавочна, што “Папараць-кветка” знаходзілася пад вялікім уплывам Слуцкай арганізацыі БПС-Р, старшынёй якой быў М.Асвяцімскі, сакратаром - А.Бараноўскі. Нават хорам кіраваў эсэр Васіль Русак, а загадчыкам бібліятэкі, што сабралі вучні, быў Пётра Фёдараў, прыхільнік эсэраўскай праграмы. Праз культурніцкія праграмы БПС-Р уплывала на маладзёвыя гурткі.

Моладзь не цуралася палітыкі. На ўсіх пасяджэннях Слуцкага Нацыянальнага камітэта прысутнічалі сябры праўлення “Папараць-кветкі”, часцей за ўсё Бараноўскі і Бусел (3). Такая шырокая дзейнасць слуцкай моладзі не засталася па-за ўвагай грамадскасці. Варта прывесці водгук на выхад часопіса арганізацыі, які надрукавала газета “Беларусь” 15 лістапада 1919 года пад красамоўным загалоўкам “Моладзь ідзе!” “Перада мной ляжыць беларускі часопісь “Наша каляіна”, - пачаў невядомы аўтар К-а, - выдана яна ў Слуцку. Слуцк -павятовы гарадок - куды яму, здавалася бы лезьці ў людзі; да яшчэ з сваёй газэтай! Аднак палез. Беларуская душа, як бачым, жывучая, творчая, як яе не заганяй ў казіны рог, а яна збудзіцца і затрапечацца. Мала таго: гэты часопісь з’яўляецца органам беларускай нацыянальнай злучнасці “Кветка Папараці”, каторая сваю чыннасць пашырыла на ўвесь Слуцкі павет і нават далей за яго межы. Гэта папраўдзе, як і ў песьні спяваецца “А ў Слуцку на рыначку сталася праява!” Так, сябры, гэта вялікая праява! Адбудаваньне незалежнасці Беларуская дзяржавы бярэ ў свае рукі наша моладзь. Чэсць і слава табе, моладзь, паўстаючая з-пад беларускай саломеннай страхі!.. На бок з дарогі, панове і гаспада з Заходу і Усходу. Беларуская моладзь ідзе!” Дарэчы, збіраючы матэрыял для свайго часопіса, С.Бусел і яго сябры Іван Урбановіч і Ракуцька дасталіся ў Мінск, наведалі Максіма Гарэцкага і Янку Купалу. Першы даў ім апавяданне, другі - два сваіх вершы. Мажліва, аўтар згаданага артыкула, падпісанага крыптонімам “К-а”, і ёсць сам Янка Купала.

Вакол “Папараці” гуртавалася цудоўная моладзь. Амаль усе з вёскі, сялянскія дзеці. Надрэнна адукаваныя навучэнцы гімназіі, камерцыйнай і тэхнічнай вучэльняў Слуцка, семінарысты з Мінска і Нясвіжа аддалі перавагу дэмакратычнай незалежнай Беларусі.

З 1917 года крок за крокам паспяхова набывала вядомасць “Зарніца” - культурна-асветніцкі гурток з вёскі Старыца. Напярэдадні новага, 1918 года, “Вольная Беларусь” надрукавала Статут арганізацыі і спіс 12 сяброў, сярод іх - будучыя актыўныя ўдзельнікі Слуцкага паўстання: Пётра Зянюк, настаўніцы Марыя і Людміла Стагановіч, Аляксандр і Іван Колпакі (4), Сцяпан Верабей, Аляксандр Русаковіч, Язэп і Дзяніс Клюйко, Адам Чачко, якія ўзначаляць антысавецкія атрады ў 1921-1922 гадах (5). А яшчэ ў лістападзе 1917 годзе яны выступілі з праграмай, якая прадугледжвала змаганне за аўтаномію Беларусі, беларускую мову ў школах і беларускае войска (6). Галоўнаю турботаю “Зарніцы” было набыццё беларускіх кніжак. Сябры звярталіся нават у

агітацыйна-выдавецкі аддзел Беларускага Нацыянальнага камітэта ў Петраградзе з просьбаю выслаць "накладною платаю" кніжкі Е.Канчара, Д.Сабалеўскага, матэрыялы 1 Беларускага кангрэса, штотыднёвік "Чырвоны шлях" і "Беларускую крыніцу" (7).

Літаратурныя, краязнаўчыя гурткі былі вельмі папулярной формай нацыянальнай працы. Яны існавалі амаль у кожнай вёсцы, дзе была школа. Так, у вёсцы Гулевічы аформіўся гурток "Селянін" (8). Свая "Зарніца" запрацавала ў вёсцы Слабада-Кучынка. Яе зарганізаваў Адам Бабарэка. Нават вершы з'явіліся ў гонар асветнікаў-адраджэнцаў (9). Грамадства адчула іх запатрабаванасць і ўплывовасць. Святар саборнай царквы ў Слуцку Шамеціло з амбону прамаўляў: "Як зоркі ў небе ў цёмную ноч свецяць і паказваюць дарогу зблудзіўшаму чалавеку, так для вас гэтае зоркі ёсць беларускія культурна-прасветныя арганізацыі. Прыглядайцеся да іх і яны вам пакажуць шлях к лепшаму жыццю" (10).

Паўсюдна на вёсках узнікалі гурткі рупліўцаў беларускай справы з цікавымі аптымістычнымі назвамі: "Вясковая зорка", "Полымя", "Бацькаўшчына" (11).

Вялікую ролю ў выхаванні пачуццяў нацыянальнай свядомасці і патрыятызму адыгралі павятовыя настаўніцкія курсы, якія пад час польскай акупацыі арганізаваў Слуцкі Нацыянальны камітэт. Да таго моманту, як ў Слуцк з'ехалася каля 200 настаўнікаў пачатковых школ, была зроблена вялізарная падрыхтоўчая работа: падлічана колькасць ужо існаваўшых беларускіх школ у павеце, атрыманы дазвол польскай улады аб адкрыцці беларускіх школ. Сярод настаўнікаў беларуская улада правяла шырокую тлумачальную працу аб неабходнасці і своечасовасці адукацыі на роднай мове. Сродкі на арганізацыю курсаў атрымалі ад Беларускага Нацыянальнага камітэта з Мінска. Пры дапамозе польскага школьнага інспектара настаўнікаў выклікалі ў Слуцк у школьную Раду. Курсантам давялі, што будуць выкладацца беларуская мова, гісторыя беларускай літаратуры, гісторыя Беларусі, геаграфія, спевы, кааперацыя і іншыя прадметы (12). Андрэю Бараноўскаму даручылі забеспячэнне курсаў памяшканнем, курсантаў - жыллём і харчаваннем. ЦК БПС-Р прыслаў лектараў. Беларускую мову і літаратуру чытаў Янка Станкевіч, гісторыю Беларусі - Усевалад Ігнатоўскі, геаграфію - Мікалай Азбукін. Некалькі лекцый па мовазнаўстве прачытаў Браніслаў Тарашкевіч (13).

Для прапаганды сваёй партыйнай праграмы на курсах мэтанакіравана працавалі і агітавалі эсэры. У выніку былі створаны

новыя арганізацыі ў вёсках Старыца, Гулевічы, Ячава... На гэтых самых курсах з мэтай аб’яднання настаўнікаў было ўтворана “Настаўніцкае кааператыўнае таварыства беларускай кнігі”. Быў распрацаваны і зарэгістраваны статут таварыства, сабраны некаторыя сродкі. Сябры таварыства, паводле статута, павінны былі папулярызаваць і распаўсюджаваць беларускую кнігу, выхоўваць любоў да роднага слова.

Такім чынам рыхтавалася духоўная глеба нацыянальнага ўздыму. Гэта была вялікая планамерная праца палітыкаў і грамадскіх дзеячоў таго часу.

К р ы н і ц ы. З а ў в а г і

1.Допісы //Беларускае жыцьцё. - 1920 г., 28 студзеня. - С.7.

2.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа А.Бараноўскага.

3.Там жа.

4.Вольная Беларусь. - 1917 г., 31 снежня.

5.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа П.Бабарэкі.

6.Вольная Беларусь. - 1917 г., 8 снежня.

7.Дзяржаўны архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва Ленінградскай вобласці. - Ф.75, воп.1, сп.44, а.6.

8.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа С.Бусла. БДА МЛіМ. - Ф.3, воп.1, сп.56, а.157.

9.Юрка Прышчэпа. Ахвярую гурткам “Зарніца” у вёсках Слабада-Кучынка і Старыца //Вольная Беларусь. - 1918 г., 9 чэрвеня.

10. Беларускае жыццё. - 1920 г., 28 студзеня.

11. Там жа.

12.Беларусь. - 1920 г., 7 красавіка.

IV. Кіраўнікі. Арганізатары

Асветніцка-выхаваўчая праца - гэта толькі адзін бок шматграннай дзейнасці Нацыянальнага камітэта Случчыны, які быў утвораны яшчэ ў 1918 годзе. Праўда, з вясны наступнага года нейкі час на Случчыне панаваў рэўком, але нядоўга. Пад час другой польскай акупацыі дзейнасць Нацыянальнага камітэта была адноўлена. Мясцовы орган самакіравання паўстаў зноў намаганнямі яго чатырох членаў - П.Жаўрыда (старшыня), Ул.Пракулевіча, У.Дубіны (сакратар), пазней шляхам кааптацыі ўвялі Н.Смольскага, былога слуцкага казначэя.

Нацыянальны камітэт сачыў амаль за ўсімі бакамі грамадскага жыцця. Яго намаганнямі былі створаны розныя кааператыўныя саюзы, членамі якіх з'яўляліся жыхары Слуцка і навакольных вёсак. Сябры Нацкама, як правіла, уваходзілі ў кіраўніцтва гэтых саюзаў. Людзі прыходзілі да высновы, што яны някепска гаспадараць у сваім доме.

Прытрымліваючыся дэмакратычных прынцыпаў, шмат пытанняў камітэт выносіў на разгляд сходаў. Пошукі сродкаў на развіццё адукацыі і культуры, арганізацыя войска, утварэнне нацыянальных камітэтаў, органаў улады на месцах, - гэтыя і іншыя праблемы вырашаліся, як правіла, грамадою. Па прапанове камітэта збіраліся ахвяраванні для беспрацоўных, праводзіліся платныя спектаклі, аукцыёны. Атрыманыя сродкі ішлі на закупку харчавання для тых, хто меў патрэбу ў дапамозе.

Шмат намаганняў прыкладаў Нацкам, каб бараніць насельніцтва ад рэпрэсіўнай палітыкі польскіх уладаў. Некалькі разоў акупанты спрабавалі разагнаць настаўніцкія курсы, учынялі вобыскі, пагражалі арыштамі, але, як правіла, дыпламатычным шляхам перамоў канфлікты ўладжваліся (1).

Такім чынам, Нацыянальны камітэт быў цэнтрам палітычнага і сацыяльнага жыцця, органам нацыянальнага дзяржаўнага кіравання. Як бачым, развіццё нацыянальнага руху дасягнула той кропкі, калі з яго вылучаліся лідэры, арганізатары. Ва ўмовах амаль няспыннай вайны, акупацыі (польскай, нямецкай, бальшавіцкай) гэтыя людзі рупіліся аб пабудове ўласнага дома, уладкаванасці сваёй малой радзімы. Яны шукалі выйсця.

Большыню прыхільнікаў узброенага змагання за незалежнасць аб'яднаў Слуцкі камітэт Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Наяўнасць гэтага палітычнага цэнтра забяспечыла арганізацыю паўстання, выпрацоўку стратэгічных мэтаў і тактычных

крокаў. Менавіта БПС-Р арганізацыйна аформіла стыхійны сялянскі пратэст. Слуцкая арганізацыя мела моцны ўплыў і распаўсюджаную сетку сваіх структур і груп падтрымкі на месцах. Эсэры своечасова скарысталі шырокую хвалю незадаволенасці перамовамі ў Рызе. Яны прынялі зварот да насельніцтва Беларусі, у якім растлумачылі трагічны сэнс бессаромных дамоўленасцей: “Гэты мір штурхае беларускі народ на шлях упартай барацьбы, на шлях вайны за незалежнасць і недзялімасць сваёй Радзімы. Польшча і Расія, не маючы паміж сабою агульных межаў, вялі на працягу апошняга года разбуральную вайну на беларускай тэрыторыі, без удзелу прадстаўнікоў беларускага народа 12 кастрычніка падпісалі дамову аб прэлімінарным міры, на падставе якога Беларусь падзелена на дзве часткі” (2).

Улёткі эсэраў паведамлялі: “У абдымках польскага імперыялізму і шавінізму пакінута трэццяя частка беларускай тэрыторыі з насельніцтвам у 4 млн. жыхароў, сярод якіх палякаў ад 2 да 8%. Польшча на гэтыя прадвечна беларускія землі не мае ні этнаграфічных, ні гістарычных правоў.

Савецкая Расія задаволілася 180000 км^2 беларускай тэрыторыі з насельніцтвам у 8 млн. жыхароў. Незалежнасць Савецкай Беларусі - гэта фікцыя, якая прыкрывае сабою акупацыю беларускага народа расійскім цэнтралізмам. Мір гэты патаптаў святыя правы народаў на самавызначэнне. Гэты мір разрывае жывое цела беларускага народа і не дае яму так горача жаданых умоваў спакойнага стваральнага жыцця” (3).

Слуцкія эсэры далучыліся да патрабаванняў беларускіх сацыялістаў, сацыял-дэмакратаў і сацыял-федэралістаў і іншых палітычных партый і плыняў перагледзець умовы прэлімінарнага міру і “устанавіць расійска-беларускія і беларуска-польскія межы на падставе этнаграфічных прызнакаў”, ачысціць этнаграфічную тэрыторыю Беларусі ад польскіх і расійскіх акупацыйных войскаў. Моцную падтрымку случакі выказалі патрабаванням неўмяшальніцтва як Польшчы, так і Расіі ва ўнутраныя беларускія справы. Гэтыя стратэгічныя мэты сталі вядомы ў шырокіх колах грамадства. Яны сталі праграмай праграмай дзеянняў восені 1920 года.

“Dei minoris - малодшыя багі”, - так, жартуючы называлі сябе кіраўнікі Нацыянальнага камітэта і арганізатары Слуцкага паўстання Павел Жаўрыд і Уладзімір Пракулевіч, саступаючы самую вышыню беларускага палітычнага Алімпа бацькам Адраджэння, нацыянальным стратэгам Вацлаву Ластоўскаму і братам Луцкевічам. Не хварэючы

на амбіцыёзнасць, але адчуваючы сваю значнасць, самакаштоўнасць, яны залічылі сябе ў другі эшалон тагачасных палітыкаў. Як быццам падкрэслілі, што яны - не тэарэтыкі, а выканаўцы.

Адна з галоўных постацей у гісторыі Слуцкага паўстання - Павел Якаўлевіч Жаўрыд. Ідэі, пошукі, справы гэтага чалавека знаёмыя, на жаль, толькі лічаным спецыялістам, у асноўным тым, хто даследуе нашу гісторыю ў былых спецсховішчах. Па ўсіх канонах савецкай гісторыяграфіі і юрыспрудэнцыі ён - “дзяржаўны злачынец”. Але пры ўсіх намаганнях зрабіць звычайнага крымінальніка з адукаванага юрыста, шляхетнага афіцэра, вядомага ў свой час палітыка, выхаваценя і асветніка моладзі было даволі складана. Таму, каб не ўзнікала пытанняў, каб яго хутчэй забылі, імя Жаўрыда ўпарта замоўчвалася. Яго жыццё засталося ў невядомай нам доўгія гады сапраўднай гісторыі; ў “паралельнай”, якая была створана за савецкім часам, яму (і шмат яшчэ каму) не было месца.

Жыццёвы шлях яго быў вельмі складаны. Наканавана было Паўлу Жаўрыду, як і ўсім тым, хто нарадзіўся напрыканцы мінулага стагоддзя ці на пачатку новага, XX-га, гэта значыць - на мяжы, на пераломе - прайсці яго з вялікімі цяжкасцямі, у пошуках ісціны і барацьбе за ідэю. Нацыянальную.

Павел Жаўрыд нарадзіўся 1 чэрвеня 1889 года ў фальварку Цецераўка Слуцкага павета. Бацькі яго арандавалі, бо сваёй зямлі не мелі. Жаўрыды паходзілі са збяднелай шляхты Целядавіцкай воласці. У 1905 годзе яго бацька, Якаў Жаўрыд, скарыстаўшы пазыку сялянскага банка, здзейсніў сваю даўнюю мару - набыў хутар у Старобінскай воласці. Называўся ён Магільскі і належыў памешчыку Рэгелю. Сям’я такім чынам набыла 45 дзесяцін малапрыдатнай для земляробства зямлі. Вымушаныя плаціць немалыя грошы банку і не маючы па першым часе прыбытку ад зямлі, Жаўрыды натуральна галадалі. Дапамагчы сыну, які ў той час вучыўся, бацька не мог.

Адукацыю Павел пачаў набываць у народнай вучэльні Грэска. Працягваў вучыцца ў Слуцкай гімназіі. На хлеб зарабляў урокамі. Дапамагалі і сябры. У Слуцку Павел нейкі час карыстаўся гасціннасцю дома Асвяцімскіх. З Маркам Асвяцімскім, вядомым беларускім эсэрам, яшчэ доўгія гады будзе звязаны не толькі сяброўскімі адносінамі, але і агульнымі партыйнымі і грамадска-палітычнымі інтарэсамі.

Блізкае знаёмства адбылося і з Фабіянам Шантырам. Абодва захапіліся палітыкай. Не трэба забывацца, што юнацтва гэтых людзей прыпадае на гады першай рускай рэвалюцыі. Гімназісты ўжо з 4-га класа

збіралі нелегальныя сходы, распаўсюджвалі літаратуру і рабілі самі даклады на рэвалюцыйныя тэмы. Да рэвалюцыйнай справы шаснаццігадовы юнак ставіўся настолькі сур’ёзна, што гімназісты даюць яму мянушку “Арганізацыя”. Але рэвалюцыйныя страсці пакрысе аціхлі. Скончыўшы гімназію ў 1909 годзе, Павел паступае ў Варшаўскі універсітэт, дзе набывае юрыдычную адукацыю (4).

На жаль, сведчанняў аб жыцці Паўла Жаўрыда захавалася няшмат. Большая частка фотаздымкаў, што знаходзяцца ў адным з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва музыкі, літаратуры і мастацтва, не ідэнтыфікавана. Сямейны альбом Жаўрыдаў прадстаўляе цудоўныя інтэлігентныя твары людзей выхаваных і адукаваных, сціплы, але добра ўладкаваны, цывілізаваны побыт дома, шляхетныя манеры і вытанчаны густ гаспадароў і іх гасцей. Разумным, добразычлівым, усмешлівым позіркам глядзяць тыя людзі з фотаздымкаў. Напярэдадні Першай сусветнай вайны Жаўрыд -рэспектабельны, самавіты малады чалавек. Стомлены, стары не па гадах - на фотаздымку з крымінальнай справы 1930 года. Паміж імі адрэзак жыццёвага шляху даўжынёй усяго ў 14 год. Але за гэты час свет кардынальна змяніўся і ўмовы існавання людзей таксама. Праўда, Жаўрыд з тых людзей, хто спрабаваў супраціўляцца гэтым зменам, але яны набылі незваротны характар стыхійнага бедства.

Павел Жаўрыд - у пэўным сэнсе чалавек Першай сусветнай вайны. Гэтая падзея паклала пачатак агульнаму хаосу, узрушыла грамадства. Бессэнсоўныя перасоўванні агромністых людскіх натоўпаў Жаўрыд назіраў пад час службы ў так званай “паўночнай дапамозе” уцякачам з тэрыторыі Заходняга фронту. Вялікую колькасць беларусаў тая вайна раскідала па свеце. На фронт ён не трапіў. Службу праходзіў спачатку ў Цвяры, потым вучыўся ў Віленскай вайсковай вучэльні, якая ў той час знаходзілася ў Палтаве. Там і даведаўся аб адрачэнні цара і ўсталяванні ўлады Часовага ўраду. Пасля заканчэння вучобы апынуўся яшчэ далей ад дома, у Туркестане. Неўтаймаваны арганізатар і асветнік, ён чытае жаўнерам лекцыі па расійскай гісторыі, ствярае камісію па культурным выхаванні, абіраецца ў Казалінскі савет. Як дэпутат адчуваў пэўныя цяжкасці, бо не ведаў кыргізскай мовы. У жніўні 1917 года полк, у якім служыў Жаўрыд, накіроўваецца на Румынскі фронт. Тут хутка ён быў абраны старшынёй палкавога камітэта. Беларусы Румынскага фронта дэлегіравалі яго на І Беларускі кангрэс, але ў тэрмін у Мінск ён не дабраўся з-за транспартных цяжкасцей і паспеў толькі на самы канец работы з’езду. На фронт

больш не вярнуўся. Старая армія развалілася. Кастрычнік і нямецкую акупацыю пераседзеў на бацькоўскім хутары. З прыходам у Слуцк савецкай улады пайшоў да яе на службу, атрымаўшы прапанову заняць месца юрыдычнага кансультанта зямельнага аддзела. Але адносіны з новаю ўладай не заладзіліся з самага пачатку.

Старшыня Цэнтральнага Бюро Камуністычнай партыі Карл Ландэр уключыў Жаўрыда ў склад рэвізійнай камісіі па праверцы дзейнасці Слуцкай ЧК. Праніклівы рэвізор выкрыў шматлікія злоўжыванні. Чэкісты не прамінулі адпомсціць, арыштавалі быццам бы за сувязь з Дзянікіным. Да белага руху Жаўрыд не меў дачынення, тым не менш апынуўся ў Слуцкай турме, а з падыходам польскай арміі - ў Бабруйскай крэпасці і далей - у Смаленскай ЧК. Змог вярнуцца ў родны Слуцк у студзені 1919 года разам з польскімі закладнікамі, якіх польскі бок вымяняў на расійскіх зняволеных.

На радзіме яго ўжо чакалі. Завочна абралі старшынёй Нацыянальнага камітэта. Ведаючы яго незвычайную грамадскую і палітычную актыўнасць яшчэ з часоў першай рускай рэвалюцыі, случакі зрабілі свядомы выбар.

Баронячы насельніцтва ад праследу польскіх уладаў, дамагаючыся вызвалення арыштаваных, патрабуючы матэрыяльнай і вайсковай дапамогі, Жаўрыд быў сапраўдным дыпламатам. Не псуючы адносінаў ні з кіраўніком Слуцкай дэфензівы Сабескім, ні з камандзірам 11 польскай дывізіі, што займала тэрыторыю павета, палкоўнікам Ясінскім, Жаўрыд і ўзначалены ім Нацыянальны камітэт захоўвалі самастойны палітычны курс.

Якраз за дзень да адкрыцця з’езда Случчыны, 13 лістапада, Жаўрыд вярнуўся з Варшавы, дзе спрабаваў вызначыць лёс павета, сустракаўся з сябрамі беларускага ўраду - Найвышэйшай Радай, ад якой атрымаў прадстаўнічыя паўнамоцтвы камісара.

У Слуцку яго чакаў граф Чапскі. Ён прыехаў разведаць настрой у павеце. У адказ на пытанне графа, з кім случакі, Жаўрыд моўчкі паказаў пячатку Рады з літарамі Б.Н.Р. - Беларуская Народная Рэспубліка. Не гаворачы ні слова, граф устаў і пакінуў пакой.

Ні з Польшчай, ні з Масквою, а з беларускім народам - крэда гэтага чалавека і яго сяброў.У гарачы момант падрыхтоўкі арміі паўстання Жаўрыд змог згуртаваць вакол сябе людзей адметных.

Слуцкай гісторыі належыць і асоба Уладзіміра Пракулевіча. Малавядомая таксама, бо заслона жорсткіх стэрэатыпаў сталіншчыны, а таксама наступнае замоўчванне і гэтую постаць схавалі ў цемры

няведання. Ён заўсёды быў побач з Жаўрыдам. Яны - аднадумцы, аднапартыйцы, калегі і сваякі. Жаўрыд пабраўся з сястрой Пракулевіча.

Кіраўнік і арганізатар паўстанцкага руху Уладзімір Міхайлавіч Пракулевіч нарадзіўся ў 1887 годзе ў мястэчку Красналукі Барысаўскага павета ў сям'і пісара і настаўніцы. Веды набываў спачатку ў Смаленскай гімназіі, потым, з 1908 па 1912 гады, ў Маскоўскім універсітэце на юрыдычным факультэце. У Маскве далучыўся да сацыял-дэмакратычнага руху. Вярнуўшыся ў Барысаў, спачатку ўвайшоў у гарадскую арганізацыю Бунда, потым разам з аднадумцамі заснаваў Барысаўскую групу РСДРП. З арганізацыяй Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў стаў адным з актыўных яе членаў.

Не выпадкова, што на Случчыне, куды трапіў пасля назначэння суддзёю ў мястэчка Вызна (цяпер -Чырвоная Слабада), адразу блізка сышоўся з эсэрам Жаўрыдам і яго паплечнікамі. Аднойчы перакрыжаваўшыся, іх жыццёвыя шляхі сышліся. Пракулевіч не быў схільны высвятляць адносіны з савецкай уладай шляхам ваеннага канфлікту. На з'ездзе Случчыны ён выступіў з палымянай прамовай, заклікаючы абмежавацца ўтварэннем органаў мясцовай улады, дэманстрацыяй сіл міліцыі і не даводзіць справу да баявых сутычак. Але падпарадкаваўся рашэнню большасці дэлегатаў з'езду - рыхтаваць узброенае супраціўленне і не дапусціць Чырвоную армію ў павет (5).

Ужо цытаваліся вытрымкі з "нарыса" Уладзіміра Пракулевіча па гісторыі Слуцкага паўстання. Чалавек ён быў змястоўны. Калі адкінуць у бок няшчырыя ацэнкі (у 1930 годзе ўжо трэба было думаць і дбаць аб захаванні жыцця), нарыс, безумоўна з'яўляецца каштоўнай крыніцай для даследавання падзеі. Аб'ектыўныя гісторыкі звернуць увагу на багацце фактычнага матэрыялу, паслядоўнасць падзей, вялікую колькасць імёнаў і прозвішчаў удзельнікаў, разумеючы, што ацэнкі з'явіліся пад уціскам следчага і пагрозай смерці.

Гэты дакумент і іншыя крыніцы былых сакрэтных спецсховішчаў прадстаўляюць шмат дзеючых асобаў гарачай восені 1920 года і не менш пякучай рэчаіснасці 1921: прыхільнікаў жорсткіх ваенных метадаў, тэрору і дыверсій вайскоўцаў Антона Самусевіча, Івана Мацэлі, Паўла Бранавіцкага з аднаго боку і праваднікоў больш памяркоўных палітычных рашэнняў - Васіля Русака, Юліяна Сасноўскага, Аляксея Кабычкіна і шмат каго іншага. Маючы адзіную стратэгічную мэту, гэтыя людзі прапаноўвалі розныя шляхі яе дасягнення.

Вялікі ўплыў на вызначэнне пазіцыі пэўнай часткі паўстанцаў меў генерал Булак-Балаховіч. Ён прапаноўваў сваю падтрымку пры ўмове прызнання яго камандавання. Нацыянальны камітэт адмовіўся ад падтрымкі генерала і тых палітычных колаў, якія гуртаваліся вакол яго. Аднак значная частка случакоў спадзявалася на магчымы хаўрус з генералам. Ваенны ў першую чаргу.

К р ы н і ц ы. З а ў в а г і

1.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа "СВБ". Паказанні Ул.Пракулевіча, П.Жаўрыда, У.Дубіны.

2.БДА МЛіМ. Ф.3, воп.1, сп.243, а.97.

3.Там жа.

4.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа "СВБ". Паказанні П.Жаўрыда.

5.Там жа. Паказанні Ул.Пракулевіча.

V. Нязгода

Пасля адыходу чырвоных жыццё ў горадзе пакрысе наладжвалася. З дазволу акупацыйных уладаў пачало дзейнічаць гарадское грамадскае самакіраванне, але члены яго адразу прызналі прыярытэт Нацыянальнага камітэта. Праблем хапала. Колькасць жыхароў горада і павета ўзрасла ў шмат разоў. На Случчыне асела не менш за пяць тысяч дэзерціраў з Чырвонай арміі. Адусюль сцякаліся афіцэры і жаўнеры. Вярталіся ў свае мясціны былыя дзянікінцы. Пасля паражэння спяшаліся да мяжы балахоўцы. Атмасфера накалялася. Разгараліся палітычныя спрэчкі. Ад Нацыянальнага камітэта людзі патрабавалі арганізацыі абароны Случчыны. З аднаго боку раздаваліся галасы аб стварэнні ў Слуцку новых балахоўскіх атрадаў. З другога - толькі самастойных фарміраванняў.

Першыя спадзяваліся на дапамогу Польшчы. У невялікай колькасці, але ж былі сярод іх прыхільнікі дзяржаўнага саюза з заходняй суседкай. Большасць гэтай плыні мела надзею, праўда, даволі хісткую, адносна прыстойных паводзін Польшчы ў вырашэнні беларускіх праблем. Пад уздзеяннем прапаганды “федэралісцкай канцэпцыі” у беларускім демлагеры сфарміравалася паланафільскае крыло.

Паводзіны палітыкаў, якія спрабавалі разыграць польскую карту, можна зразумець. Яны лічылі, што Польшча, якая нядаўна цяжкім шляхам барацьбы набыла незалежнасць, зацікаўлена ў тым, каб мець буфер - тэрыторыю самастойнай Беларусі паміж сабою і чырвонаю Масквою. Новы склад камітэта меў намер звярнуцца з просьбай аб дапамозе да таго народу, які нядаўна сам здабыў сабе вольнасць, да народу, які таксама змагаўся з бальшавікамі, што хацелі пазбавіць яго гэтай вольнасці.

Другая групоўка, а гэта ў асноўным эсэры, стаяла на цвёрдых незалежніцкіх пазіцыях - “Супраць паноў і камуністаў” (1).

Гэтае супрацьстаянне лідэраў і арганізатараў паўстання самым негатыўным чынам паўплывала на ход падзей. Толькі згода беларускіх дзеячоў, якія рабілі вялікую палітыку ў тыя часы, магчыма, прынесла б поспех.

Між тым абедзве групоўкі вымагалі ад Нацыянальнага камітэта пэўных палітычных дэкларацый. Старшыня камітэта Павел Жаўрыд выехаў у Варшаву з мэтай атрымаць кансультацыі Найвышэйшай Рады. Сустракаўся з Тарашкевічам, Дубейкоўскім, Смолічам, якія рэкамендавалі ўзяць ініцыятыву фарміравання вайсковых частак у свае рукі. У той час Найвышэйшая Рада на перамовы з Булак-Балаховічам не ішла, хоць генерал гэтага дамагаўся. Палітычную кан’юнктуру Рада лічыла спрыяльнай для абвяшчэння самастойнай Рэспублікі, яна спадзявалася на падтрымку Польшчы, лозунгам якой аб роўнасці народаў яшчэ верыла.

Пэўная частка случакоў мела намер стварыць з Булак-Балаховічам адзіны

антыбальшавіцкі фронт і актыўна дзейнічала ў гэтым кірунку. Паланафільцы са слуцкім доктарам Арсенем Паўлюкевічам на чале вырашылі абнавіць склад незгаворлівага Нацыянальнага камітэта. Для дасягнення гэтай мэты 5 лістапада склікалі сход случакоў. Зацікаўленых сабралася каля 500 чалавек (3). Уладзімір Пракулевіч і Станіслаў Петрашкевіч прышлі на сход у той самы момант, калі выбары новых членаў у склад Нацыянальнага камітэта былі завершаны. Яны паспяшаліся аб'явіць пратэст незаконным дзеянням паланафільскага крыла. Толькі з'езд Случчыны меў права змяніць склад камітэта. Тым не менш, у той жа дзень у памяшканні Нацыянальнага камітэта з'явіліся выбраныя сходам асобы: Паўлюкевіч, Мацелі, Кабычкін, Раковіч, Анцыповіч. Яны патрабавалі прызнання сваіх паўнамоцтваў. Старыя члены камітэта былі вымушаны згадзіцца на кааптацыю трох новых членаў, якія атрымалі на сходзе большасць галасоў. Такім чынам у склад увайшлі Паўлюкевіч, Мацелі і Раковіч. Новыя члены адразу пачалі патрабаваць абмеркавання злабадзённых пытанняў: аб адносінах да Польшчы, аб неабходнасці стварэння ўласных узброеных сіл і народнай міліцыі. Міліцыя, дарэчы, ужо існавала, яна была арганізавана, ў асноўным, намаганнямі паручніка Мацелі і актыўна дзейнічала ў правінцыі, адчыняла вярбовачныя пункты. Былы склад Нацыянальнага камітэта не пажадаў прызнаць генерала Булак-Балаховіча як галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі. 7 лістапада У.Пракулевіч, С.Петрашкевіч, Н.Смольскі выйшлі са складу ўзноўленага камітэта. Улас Дубіна застаўся і нейкі час падтрымліваў блок Паўлюкевіча-Мацелі.

Між тым у Слуцк прыехалі члены ранейшага складу Нацкамітэта: эсэры Васіль Русак, Сяргей Бусел, Марк Асвяцімскі. Пагадненне з новым складам не адбылося. Старыя члены пачалі працаваць ва ўмовах амаль канспіратыўных. Непаразуменні паміж групоўкамі паглыбляліся.

К р ы н і ц ы. З а ў в а г і

1. Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа "СВБ". Паказанні Ул.Пракулевіча, П.Жаўрыда, С.Бусла, Ю.Лістапада і інш.

2.Там жа. Крымінальная справа "СВБ". Паказанні Ул.Пракулевіча.

VI. З’езд Случчыны

Нявырашаныя праблемы абедзве групоўкі выносілі на з’езд. Па вёсках раз’ехаліся інструктары для падрыхтоўкі вялікага сходу. На месцах выбіралі дэлегатаў, высвятлялі настрой насельніцтва. За тры дні да адкрыцця прадстаўнічага з’езду вярнуліся інструктары. Яны засведчылі агульнае панаванне антысавецкіх настрояў і адначасова адсутнасць выразнай цягі да Польшчы. Людзі імкнуліся да дзяржаўнай самастойнасці.

Модус прадстаўніцтва на з’ездзе быў вызначаны так: па 5 чалавек ад 15 валасцей, па 2 - ад культурна-асветніцкіх, эканамічных і іншых арганізацый, па адным ад прафесійных груп настаўнікаў, юрыстаў, па адным - ад рэлігійных канфесій (праваслаўнай, каталіцкай, іўдзейскай). Усяго 115 чалавек.

На жаль, анкеты ўдзельнікамі з’езда не запаўняліся, таму прааналізаваць склад даволі цяжка. Але дакладна вядома, што выбіралі, як правіла, людзей пісьменных, аўтарытэтных, з ліку настаўнікаў, мясцовых чыноўнікаў, сялян, якія з вайны вярнуліся афіцэрамі. Ад Пукаўскай воласці, напрыклад, былі дэлегіраваны настаўнікі Пётра Бабарэка, Іван Колпак, Пётра Зянюк. Апошні, дарэчы, да прыходу палякаў быў старшынёю Пукаўскага валаснога выканкама і меў вопыт кіравання (1).

Задача склікання з’езда была ў значнай меры аблегчана папярэдняй арганізацыйнай работай Нацыянальнага камітэта. Замест прызначаных польскай адміністрацыяй войтаў у валасцях і солтысаў ў вёсках былі абраны беларускія камітэты.

З заданнем арганізаваць дэмакратычныя выбары ў валасныя органы ўлады ад Нацкама на месцы выязжалі Васіль Русак, Васіль Цішкевіч, Уладзімір Грушэўскі. Улас Дубіна праводзіў сход ў Цараўскай воласці, Пагосце, Старобіне, Мелкавічах. Сяляне выбіралі сваіх прадстаўнікоў у мясцовыя камітэты, выказвалі словы падтрымкі ў адказ на заклікі ствараць уласную армію для абароны Бацькаўшчыны. Грамадзянскую ўладу ў Грозаўскай, Цімкавіцкай, Пукаўскай, Грэскай і Вызнянскай валасцях дапамагаў ствараць Пётр Бабарэка са сваімі паплечнікамі. Сяргей Бусел працаваў інструктарам Нацкама ў Быстрыцкай, Раманаўскай і Ленінскай валасцях. Як правіла тыя, каго выбіралі ў мясцовыя органы кіравання, адначасова былі дэлегіраваны на павятовы з’езд (2).

Польскія ўлады не перашкаджалі скліканню з’езда Случчыны,

таму што канчаткова мір з савецкай Расіяй яшчэ не быў падпісаны, і ў Рызе працягваліся мірныя перамовы. Выступленні супраць Саветаў былі на карысць Польшчы.

З'езд Случчыны адбыўся 14-15 лістапада ў Слуцку ў доме Э.Вайніловіча, фундатара Мінскага Чырвонага касцёла. У зале панаваў святочны і рашучы настрой. Дэлегаты сур'ёзна паставіліся да працэдуры правядзення сходу. Па выніках галасавання ў прэзідыум былі абраны В.Русак (старшыня), П.Жаўрыд, Ул. Пракулевіч, У.Дубіна і І.Урбановіч (сакратары). А.Паўлюкевіч паспрабаваў пратэставаць, але другое галасаванне не змяніла складу прэзідыума. Па яго выніках ў склад прэзідыума ўвайшлі тыя самыя людзі, толькі старшынёй быў абраны П.Жаўрыд.

Як засведчыў Ул.Пракулевіч, пратаколы з'езду былі ў яго адабраныя пад час арышту польскімі жандарамі ў красавіку 1921 года ў Вільні, але развіццё падзей можна прасачыць па іншых крыніцах. Увесь першы дзень гучала інфармацыя з месцаў. Спачатку адчувалася некаторая стрыманасць і асцярожнасць з прычыны нявызначанасці становішча, але ўсё мацней выказвалася думка аб неабходнасці самастойнага гаспадарання ў сваім доме. Вялікае абурэнне выказалі сяляне шматлікімі павіннасцямі: вайсковай, коннай, працоўнай, харчовай і г.д. Харчразвёрстка на бульбу, мяса, масла, яйкі, воўну разбурала гаспадарку. Харчатрады бралі як мага больш. Наўзамен - нічога. Адзін за адным выступалі пакрыўджаныя сяляне, выказваліся супраць чужой улады і толькі за тую, якую самі будуць выбіраць.

У парадку другога дня з'езда стаялі даклад Нацкамітэта і пытанне сучаснага моманту. З дакладам выступіў доктар А.Паўлюкевіч, які далажыў прысутным аб ходзе падрыхтоўкі ваеннай акцыі. Услед за ім гарачую агітацыйную прамову трымаў паручнік Мацелі. Ён заклікаў не марудзіць і разварнуць фронт супраць бальшавікоў. Катэгарычна супраць баявой акцыі, як бессэнсоўнай і крывавай, выказаўся Няронскі, дэлегат з Вызны. (Не блытаць з іншым Няронскім, сябрам Рады, загадчыкам гаспадаркі Брыгады) (3).

"И в тот момент, - успамінаў у ГПУ Ул.Пракулевіч, - запылённые эффектно влетают на сцену делегаты, вернувшиеся от Балаховича, капитан Самусевич и Крыжановский, а с ними двоюродный брат "батьки" (4). Не обращая внимания на протесты президиума, предлагавшего записаться в очередь и не прерывать порядка дня, они апеллируют к съезду. Порядок дня прерывается, собрание желает выслушать новоприбывших, которых встретило

овациями, когда узнало, что это делегация от Балаховича.

Выслушаны они были в чрезвычайной тишине, прерываемой громкими аплодисментами...” (5).

Нягледзячы на эсэраўскую непрыхільнасць, “сялянскі бацька” карыстаўся вялікаю папулярнасцю. Шмат хто з сялянаў, запісваючыся ў Слуцкую Брыгаду, быў упэўнены, што ідзе пад штандары генерала Булак-Балаховіча.

Далі слова Антону Самусевічу. Ён падзяліўся ўражаннямі ад сустрэч з генералам, падкрэсліў, што Булак-Балаховіч беларус па паходжанні і па духу. Яго армія рушыць пад сцягам незалежнай Беларусі, за зямлю і волю сялянству. Самусевіч паведаміў, што войска моцнае, хутка расце колькасна, папулярнае сярод беларусаў. Самусевіч далажыў таксама, што “бацька” даручыў яму сфарміраваць тут, на Случчыне, вайсковую адзінку.

Потым зачыталі заклікі і дэкларацыі Булак-Балаховіча, яго палітычнага саюзніка Б.Савінкава і Беларускага Палітычнага Камітэта за подпісам старшыні БПК Вячаслава Адамовіча і Паўла Алексюка.

Шмат пытанняў дэлегаты мелі да Язэпа (Юзіка) Балаховіча. Ён растлумачыў, што генерал з’яўляецца галоўнакамандуючым усіх узброеных сіл Беларусі, колькасць якіх дасягае 60 тысяч чалавек, нядрэнна ўзброеных. Войска мае артылерыю, кавалерыю, багатую амуніцыю.

Баявы дух ахапіў сход. Падалося, што вось-вось і саветы сканаюць. Страсці ўзмацняліся.

Прэзідыум вымушаны быў звярнуць увагу ўсіх прысутных на тое, што яны не на мітынгу і трэба вярнуцца да дзелавога абмеркавання пытанняў. Дачакаўшыся цішыні, заяву зрабіў П.Жаўрыд. Ён зачытаў мандат паўнамоцнага камісара ўраду БНР ад Найвышэйшай Рады, растлумачыў пазіцыі Рады адносна Б.Савінкава, абаронцы “адзінай і недзялімай”, і П.Алексюка, на яго думку, палітычнага авантурыста, не маючага шырокай падтрымкі беларускіх колаў. А яго заяву аб фарміраванні ваенных сіл БНР сустрэлі моцнымі воплескамі. Аналізуючы ход з’езду, нельга не прыйсці да высновы, што галоўная турбота прысутных - гэта арганізацыя барацьбы з саветамі, а з кім заключыць хаўрус - для бальшыні такой праблемы не існавала.

Дыскусійным было пытанне: аб’яўляць Случчыну незалежнай рэспублікай ці часткай БНР. Апошні пункт гледжання, не вельмі прыемны для Польшчы, адстойвалі эсэры. Іх пазіцыя перамагла. Гэта

знайшло адлюстраванне ў рэзалюцыі, побач, дарэчы, з ухваламі ў адрас Пілсудскага і Балаховіча. З'езд не падтрымаў прапанову Ул.Пракулевіча абмежавацца толькі ўзброенай дэманстрацыяй сіл народнай міліцыі, калі прыйдуць Саветы, не выходзячы з горада і не распачынаючы баявых дзеянняў. Настрой быў адзіны - ваяваць! (6)

Урэшце з'езд прызнаў Случчыну часткай БНР, выбраў Раду, якой перадаў усю ўладу і даручыў арганізацыю вайсковых адзінак. У Раду Случчыны ўвайшлі 17 чалавек: П.Жаўрыд, А.Паўлюкевіч, І.Мацелі, У.Дубіна, В.Русак, Ц.Раковіч, Радзюк, Ю.Сасноўскі, Я.Біруковіч, Ю.Лістапад, А.Анцыповіч, Барысавец, Ул.Пракулевіч, Рабы, П.Бабарэка, А.Колпак, А.Няронскі. Кандыдатамі былі абраны Маліноўскі, Ц.Мяшэчак, П.Валоцька, М.Міхайлоўскі, Дзятловіч (7).

Тыдзень пасля з'езду Слуцк бурліў. Працягваліся перамовы з палкоўнікам Ясінскім. Польскія ўлады чакалі запрашэнняў яшчэ пагасцяваць у павеце. Але з'езд расчараваў іх, выявіўшы свой незалежніцкі твар, нягледзячы на ўпартыя намаганні правага боку. Аднак перавага незалежнікаў была мінімальнай. Пры галасаванні за кандыдатуру старшыні Прэзідыума Рады Пракулевіч атрымаў усяго на адзін голас больш у параўнанні з Паўлюкевічам. 17 лістапада Прэзідыум Рады - Пракулевіч (старшыня), Паўлюкевіч, Жаўрыд, Рабы, Русак, Біруковіч і Сасноўскі - пачаў працаваць.

Для кіраўніцтва ўсімі бакамі сацыяльнага жыцця былі арганізаваны камісіі: юрыдычная, фінансавая, зямельная і харчовая. Паспелі нават выдаць першы загад аб нацыяналізацыі лясных багаццяў Случчыны. Гэты загад забараняў вывозіць за межы павета збожжа, жывёлу і г.д. Назіраць за выкананнем загадаў Прэзідыума павінны былі валасныя рады. Кароткі тэрмін знаходжання ў Слуцку не дазволіў засяродзіць увагу на мірнай працы. Тым не менш, хутка змянілі ўладу. Замест польскай адміністрацыі пачалі дзейнічаць нацыянальныя камітэты. У воласці па даручэнні Рады ехалі яе сябры, праводзілі тлумачальную працу па мясцовых выбарах, зацвярджалі склад камітэтаў. "При распределении обязанностей между членами Рады, - вымушаны быў давесці да ведама чэкістаў арыштаваны ў 1922 годзе Пётра Бабарэка, - мне была поручена организация гражданской власти в Грозовской, Пуковской, Греской, Вызненской и Тимковичской волостях..." (8). Улас Дубіна, таксама сябра слуцкай Рады, з той самай мэтай быў накіраваны ў Старобінскую і Цараўскую воласці. Адначасова пасланцы займаліся мабілізацыяй моладзі ў войска. Ваенныя пытанні трэба было вырашаць першапачаткова (9).

23 лістапада польскія ўлады паведамілі, што пакідаюць Слуцк. Гараджане спачатку запанікавалі, потым абурыліся, зразумеўшы, што палякі не далі ні часу, ні магчымасці ўмацавацца нацыянальнаму руху, сабраць сілы. Рада надрукавала паведамленне аб сваёй эвакуацыі і заклік запісвацца ў добраахвотніцкія атрады. Хутка быў прыняты зварот да савецкага ўрада. Ноту ўручылі савецкім прадстаўнікам пры 11-й польскай дывізіі для перадачы па назначэнні. У дэкларацыі за подпісамі Пракулевіча, Жаўрыда, Русака, Сасноўскага і Радзюка гаварылася: “У момант самавызначэння ўсіх народаў і змагання за сваю самастойнасць і свабоду Беларуская Рада Случчыны выконвае волю сялянства, паслаўшага яе і даверыўшага ёй абарону незалежнасці нашай Бацькаўшчыны Беларусі, заяўляе ўсяму свету аб намаганнях, намерах беларускага сялянства, аб тым, што Беларусь павінна быць вольнаю незалежнаю рэспублікай у яе этнаграфічных межах. Абвяшчаючы аб гэтым і з’яўляючыся выразнікам волі народаў, слуцкая Рада дэкларуе цвёрда стаяць за незалежнасць роднай Беларусі і бараніць інтарэсы сялянства ад гвалту з боку іншаземных захопнікаў і ў выпадку патрэбы нават сілаю зброі, нягледзячы на колькасную перавагу ворага, думаючы, што наша справа - справа праўдзівая, а праўда заўсёды закрасуе” (10).

Рада Случчыны пратэставала супраць намеру савецкіх уладаў заняць Слуцк пасля адыходу польскіх войскаў, спасылаючыся на пастановы Рыжскай канферэнцыі аб прызнанні самавызначэння народаў.

Адначасова Рада звярталася да дэмакратыі ўсяго свету з пратэстам супраць падзелу незалежнай БНР. “З’езд катэгарычна пратэстуе проці акупацыі родных зямель чужацкім наездам і проці самазванай савецкай улады, як урад Кнорына і іншыя, якія наўтвараліся на Беларусі. Бацькаўшчына наша зруйнавана чужынцамі, якія нішчаць яе і дагэтуль. Мы, аддаючы справе адбудаваньня нашай Бацькаўшчыны ўсе нашы сілы і жыццё, звяртаемся да ўсяго свету і саюзу народаў аб дапамозе ў стварэнні нашай вайсковай сілы” (11).

Прыняцце ўхвалы на з’ездзе суправаджалася моцнымі воплескамі і заклікамі: “Няхай жыве вольная незалежная дэмакратычная БНР у яе этнаграфічных межах!”, “Няхай жыве беларускі народ!”, “Няхай жыве Беларуская армія!” і г.д.

Эвакуацыя Слуцка скончылася 24 лістапада. Адным з апошніх горад пакідаў Пракулевіч. Каля будынка, што займала Рада, эсэр Куніцкі раскідваў антыбальшавіцкія адозвы. Рушылі на Семежава.

К р ы н і ц ы. З а ў в а г і

1.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа П.Бабарэкі, Ю.Лістапада, У.Дубіны.

2.Там жа.

3. Там жа. Крымінальная справа “СВБ”. Паказанні Ул.Пракулевіча, П.Жаўрыда, Ю.Лістапада.

4.Ю.Балаховіч у 1922 годзе быў забіты чырвонымі партызанамі ў Белавежскай пушчы.

5.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа “СВБ”. Паказанні Ул.Пракулевіча.

6.Там жа.

7. ДА РФ. Ф.5875, вып.1, сп.24, а.15. Спіс удакладнены па ўласнаручных запісах В.Русака. Піліп Валоцька загінуў 27 лістапада 1920 г.

8.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа П.Бабарэкі.

9.Там жа. Крымінальная справа У.Дубіны.

10.ДА РФ. Ф.5875, воп.1, сп.24, а.14.

11.БДА МЛіМ, ф.3, воп.1, сп.243, а.80.

VII. Арганізацыя войска

Ініцыятыва арганізацыі ўзброеных сілаў зыходзіла ў першую чаргу ад учарашніх афіцэраў арміі Булак-Балаховіча і яго прыхільнікаў. Амаль на кожным пасяджэнні Прэзідыума Рады Паўлюкевіч уздымаў пытанне аб запрашэнні "бацькі" у якасці ваеннага кіраўніка. "Сялянскі правадыр" пасля паражэння яго палескага паходу не губляў надзеі ўзначаліць паўстанцкі рух на Случчыне. У ваенную тройку Нацыянальнага камітэта першага складу, дзе большасць належыла балахоўцам, увайшлі І.Мацелі, Бачко, А.Анцыповіч. Потым, пасля змены кіраўніцтва Нацкамітэта, зменіцца і яе склад. У яе ўвойдуць П.Жаўрыд, А.Анцыповіч, П.Чайка. Намаганнямі паручніка Мацелі ў павеце была арганізавана народная міліцыя, якая з'явілася грунтам для фарміравання войска БНР. Першапачаткова яна налічвала да 5 тысяч чалавек (1).

Маючы досвед і незалежніцкія перакананні, некаторыя афіцэры выступілі ініцыятарамі фарміравання баявых адзінак. Актыўную працу па ўтварэнні коннага палка разгарнуў капітан Антон Самусевіч, вярнуўшыся на радзіму ў Слуцк у жніўні 1920 года. Неблагі арганізатар, ён сагітаваў у полк каля 2,5 тысяч чалавек. Спадзеючыся на матэрыяльную падтрымку С.Булак-Балаховіча, Самусевіч хуценька з'ездзіў да бацькі ў Тураў, а потым і ў Лунінец. Прасіў зброі, амуніцыі, абмундзіравання. Але Начальнік Беларускай дзяржавы, як абвясціў сябе Булак-Балаховіч па прыкладу Ю.Пілсудскага, абышоўся аднымі абяцанкамі. Уся дапамога склала 30 тысяч польскіх марак. Булак-Балаховіч прызначыў Самусевіча камандзірам першага Слуцкага (Самусевіч называе его Беларускім) палка, але эсэраўская частка Рады Слуцкай не дала згоды на гэтае прызначэнне. Самусевіч здаў кіраўніцтва Паўлу Чайке, які працягваў справы арганізацыі палка. Прыняць камандаванне іншым палком Самусевіч адмовіўся з-за недахопу, як ён сам патлумачыў, самага неабходнага.

22 лістапада былі размеркаваны камандзірскія пасады і аб'яўлены загадам па Слуцкаму палку І Брыгады стральцоў БНР. Камандзірам першага батальёна быў прызначаны падпалкоўнік А.Гаўрыловіч, другога - капітан А.Сокал-Катылоўскі, трэццяга - капітан А.Колпак. Пасаду начальніка гаспадарчай часці заняў прапаршчык Кашкарэвіч. Паручнік Кахановіч выконваў абавязкі ад'ютанта. Роты ўзначалілі: 1-ю - паручнік Гузней; 4-ю - Аляксандр Савановіч; 5-ю - паручнік Павел Бранавіцкі; 6-ю - падпаручнік Кернажыцкі; імёны камандзіраў

2, 3, 7, 8, 9-ай пакуль невядомыя. Дзесяць чалавек склалі кулямётную каманду. Аддзел выведкі ўзначаліў падпрапаршчык Шыманскі. Пасля арышту брыгаднай контрвыведкай камандзіра палка П.Чайкі па падазрэнні ў здрадзе яго пасаду заняў Ахрэм (Эфраім) Гаўрыловіч, афіцэр Беларускай Вайсковай Камісіі (2).

Другі полк Слуцкай Брыгады пачаў фарміравацца ў м.Грозава (адкуль і назва палка - Грозаўскі). З 17 па 19 лістапада запіс добраахвотнікаў праводзіў камендант Грозава паручнік Пётра Бабарэка, які меў загад ад Рады Случчыны праводзіць мабілізацыю моладзі і накіроўваць яе ў Слуцк. Вярбовачны пункт месціўся ў доме грозаўскага гаспадара Хрушчыка (палац князёў Радзівілаў). Па паказаннях Бабарэкі, ход мабілізацыі кантраляваў камандзір польскага палка, нават правяраў змест зваротаў і пракламацый да насельніцтва. Пётра Бабарэка раз'язджаў на чале коннага атрада па вёсках, ён і яго памочнікі Іван Русаковіч, Пётра Зянюк, Вітко, Бычак, Мяцельскі развозілі загады Рады, расклейвалі пракламацыі. Збіралі людзей на мітынгі, тлумачылі сутнасць падзей, палымяна заклікалі бараніць сваю зямлю "ад бальшавіцкай навалы". Многа запісвалася дэзерціраў з Чырвонай арміі і моладзі з навучальных установаў (3).

Хутка імя Бабарэкі і яго дзейнасць сталі шырока вядомыя. У адзін з тых лістападаўскіх дзён да Сяргея Бусла, які ў той момант быў дома ў вёсцы Сукаўчыцы, забег сябра, настаўнік з вёскі Гулевічы, ён жа кіраўнік эсэраўскай ячэйкі Язэп Сукала. Ён паведаміў, што "па валасцях ездзіць нейкі беларускі дзеяч Бабарэка, запісвае ў войска". А тут і суседка ўварвалася ў хату з сярдзітым пытаннем да Сяргея: "Чаго ты тут сядзіш? У Слуцку збіраецца Беларусь!" Вясковая грамада, жадаючы ведаць навіны, не пашкадавала фурманкі і выправіла хлопцаў у павет (4).

Тут яны сустрэліся з Бабарэкам, які прывёў свой аддзел у Слуцк. Далей справай фарміравання Грозаўскага палка займаліся афіцэры Беларускай Вайсковай камісіі: Семеняка (Сямёнік), Арцышэўскі, Новік і інш.

Яшчэ да Слуцкіх падзеяў на Беларусі шырокую вядомасць набыло імя Лукаша Сямёніка. Яго партызанскі аддзел змагаўся з нямецкімі акупантамі. Пасля адыходу немцаў і да прыходу бальшавікоў сяляне абралі Сямёніка ваенкомам у Халапеніцкай воласці, адкуль, дарэчы, ён быў родам. З прыходам бальшавікоў Сямёніка арыштавалі. Падчас этапу з Мінскай вязніцы ў Барысаўскую атаман уцёк. Барысаўскі рэўваентрыбунал завочна асудзіў яго на смерць. Аднак газета

“Беларускае жыццё” за 9 лютага 1920 года паведаміла, што Лукаш Сямёнік утварыў аддзел з дэзерціраў (газета змясціла фотаздымак яго атрада); некаторы час трымаў уладу ў Халопенічскай, Красналуцкай і Зачысценскай валасцях Барысаўскага павета. Пазбягаючы разгрому атрада, адышоў у лясы пад Смалявічы. З арганізацыяй Беларускай Вайсковай Камісіі ўвайшоў у яе склад.

Слуцкая Брыгада была пяхотнай, два яе палкі падзяляліся на батальёны і роты. У яе складзе знаходзіліся конны атрад, палкавыя абозы і збройная майстэрня. Асобна ад Брыгады былі арганізаваны яшчэ дзве роты. Адной з іх камандаваў Іван Копец. Штаб выдаваў загады па Брыгадзе і палках, загады рэгістраваліся ў спецыяльнай кнізе.

Хутка былі размеркаваны іншыя абавязкі і пасады. Палявы шпіталь разварнуў доктар А.Паўлюкевіч. Вайсковы суд узначаліў Я.Біруковіч. Багдановіч заняў пасаду ваеннага пракурора, А.Кабычкін - абаронцы ў судзе.

Каманды, справаздачы вяліся выключна на беларускай мове. Нашыўкі ў камандзіраў былі з “конікамі” - Пагоняй. Надзявалі таксама бела-чырвона-белыя павязкі.

На фронт у Семежава БВК накіравала 20 афіцэраў, але да месца яны не даехалі. Зрабіўшы прыпынак ў Баранавічах, дзе знаходзілася камендатура Рады для сувязі з БВК і Найвышэйшай Радай, яны вярнуліся назад незадаволеныя эсэраўскай перавагаю ў кіраўніцтве (5).

Па першым часе Брыгада забяспечвалася правіянтам даволі арганізавана. Рада мела штаб інструктараў, якія раз’язджалі па вёсках, вялі агітацыю і збіралі добраахвотныя ахвяраванні правіянтам. Абавязкі інструктараў выконвалі Улас і Міна Дубіны, Юрка Лістапад, малодшы Сасноўскі, Цімафей Мяшэчак, браты Мікалай і Ілля Ракі. Ехалі, як правіла, у родныя мясціны, дзе іх ведалі і давяралі іх словам. Па бальшыні вяскоўцы добраахвотна давалі неабходнае. Толькі на мяса павіннасць была прымусовая. Ад вёскі дастаўлялі 2-3 галавы буйной жывёлы ці замянялі дробнай. За мяса выдаваліся рэквізіцыйныя квіткі, што з’яўлялася абавязацельствам Рады ў будучым кампенсаваць страты. Карміліі ваяроў неблага. Аднак запасаў гаспадарчая часць не зрабіла. Хутка паўстала праблема з харчаваннем і фуражом для коней. Ратаваліся тым, што пачалі ўжываць збожжа і сена кінутых гаспадарамі маёнткаў. Да нарыхтоўкі прадуктаў прыцягваліся ваеннапалонныя і ўцекачы, у мясцовых гаспадароў яны

малацілі збожжа, пяклі хлеб і г.д. (6).

Праблема будавання сваёй арміі вырашалася і з другога боку. Афіцэрскія кадры дазволіла рыхтаваць Польшча ў вайсковых школах Варшавы, Быдгошчы, Лодзі. У дэкрэце галоўнакамандуючага польскай арміі пра беларускі звяз гаварылася: "...Дазваляецца пры Варшаўскай Школе Падхарунжых арганізаваць беларускі з'вяз дзеля падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў для беларускага войска. Кандыдатаў у з'вяз дасць Беларуская вайсковая Камісія". Далей у гэтым жа дэкрэце паведамлялася, што "у сваім нутраным жыцьці беларускі з'вяз можа ўжываць сваю родную мову. Выклады тэарэтычныя, як і практычныя заняткі з галіны вайсковае веды, беларускі з'вяз будзе праходзіць і з сваімі польскімі сябрамі ў мове польскай" (7).

БВК, афіцэры якой адыгралі значную ролю ў пабудове I Брыгады БНР, яшчэ ў снежні 1919 года пераехала з Вільні ў Мінск. Польскія акупацыйныя ўлады прызначылі на гаспадаранне Камісіі гатэль "Гарні". Адразу ж, у снежні, з'явіліся ў мінскіх і віленскіх газетах адозвы да беларускага жыхарства. Яны заклікалі беларусаў прыбываць у Мінск для ўступлення ў беларускія вайсковыя аддзелы, створаныя БВК.

"Праз некалькі дзён пасля надрукавання адозвы БВК усе калідоры гатэля "Гарні" запоўніліся ахвотнікамі ў беларускае войска, - успамінаў член камісіі Франц Кушаль, - з грамады прыбылых былі выбраны трыццаць маладых хлопцаў, што адказвалі ўмовам, вызначаным для кандыдатаў у школу падхарунжых. Яны былі арганізаваны ў асобны аддзел" (8).

Ад'езд гэтага першага аддзела быў прызначаны на палову студзеня 1920 года. Час яшчэ быў. Яго выкарыстала Камісія для арганізацыі курсаў беларусазнаўства. У адной з мінскіх школ неўзабаве пачаліся лекцыі па гісторыі беларускага Адраджэння, беларускай мове і літаратуры. Чытаў іх Алесь Гарун.

У студзені асобны аддзел маладых беларусаў пад камандаю беларускага афіцэра капітана Талькоўскага быў адпраўлены ў Варшаву, у школу падхарунжых. У гэтую школу, якая пазней была пераведзена ў Востраў Камарова, прымаліся кандыдаты з сярэдняй адукацыяй. У ваенны час курс навукі трываў 6 месяцаў, са школы выходзілі падхарунжыя, якія служылі нейкі час у арміі і атрымлівалі званне падпаручніка. У мірны час вучыліся два гады і выходзілі адразу падпаручнікамі.

Другая школа падхарунжых для падафіцэраў была ў Быдгашчы, на Памор'і. Задача гэтай школы была даць магчымасць навучэнцам,

якія не маюць сярэдняй адукацыі, але выяўляюць здольнасці для навукі і вайсковай справы, здабыць афіцэрскі чын. Курс навучання ў гэтай школе быў чатырохгадовы, прычым два першыя гады прысвячаліся папаўненню агульных ведаў курсантаў. У гэтую школу быў адпраўлены яшчэ адзін аддзел з сарака беларускіх хлапчукоў.

Франц Кушаль, які ад БВК меў заданне курыраваць беларускія звязы, успамінаў: “Хлопцы нашыя, як з першага з’язу, так і з другога, ехалі ў Варшаву і Быдгошч з вялікаю ахвотаю, з вераю ў тое, што стануць неўзабаве беларускімі афіцэрамі і спрычыняцца да пабудовы беларускага нацыянальнага войска. Капітан Талькоўскі, камандзір з’вязу пры Варшаўскай школе падхарунжых, акуратна прысылаў у БВК рапарты аб навуцы і паводзінах беларускіх кандыдатаў. Усе нашы будучыя афіцэры вучыліся і трымаліся вельмі добра” (9).

18 лістапада 1920 года беларускіх юнкераў наведала дэлегацыя амерыканскіх беларусаў. Яна звярнула ўвагу на выдатны выгляд і выпраўку беларускіх юнакоў і выказалася за тое, каб усяляк дапамагаць стварэнню беларускага нацыянальнага войска (10).

Першы беларускі звяз скончыў курс пры Варшаўскай школе якраз пад час мірных перамоваў у Рызе. Як вядома, бальшавіцкая дэлегацыя дамагалася ад польскага ўраду згоды на неадкладнае ліквідаванне ўсіх няпольскіх вайсковых фарміраванняў. Капітан Талькоўскі з новаспечанымі падхарунжымі быў накіраваны ў Лодзь, у распараджэнне БВК. Тут іх чакала вялікае расчараванне. Мары маладых беларускіх камандзіраў аб выхаванні імі жаўнераў-патрыётаў не здзейсніліся і выклікалі пачуццё крыўды. У Лодзь прыбыў польскі маёр на чале ліквідацыйнай камісіі, якая ўзялася расфармоўваць два беларускія батальёны, што стаялі ў Лодзі. Загад аб ліквідацыі, аднак, дазваляў афіцэрам і падхарунжым перайсці на службу ў польскую армію. З афіцэраў БВК ніхто не згадзіўся на знак пратэсту супраць ліквідацыі беларускіх батальёнаў. З падхарунжых перайшлі некалькі чалавек. Астатнія вярнуліся дамоў. Тым не менш, нягледзячы на ўсе сумныя абставіны, БВК дабілася прыёму ў Варшаўскую і Быдгошчскую школы яшчэ аднаго беларускага аддзела.

Франц Кушаль успамінаў: “Неяк у 1920 годзе, яшчэ перад выхадам загаду аб ліквідацыі няпольскіх вайсковых аддзелаў, аднойчы раніцаю ў канцылярыю БВК уваішло адразу чалавек сорак юнакоў, апраненых у кажухі і бравэркі ды моцна ўкарэлыя сялянскія боты. Увайшоўшы, яны стоўпіліся грамадкаю пад сцяною і маўчалі. Раптам ад грамады аддзяліўся чалавек у шынялі расейскага афіцэра і адрапартаваў:

“Ротмістр Міранові прывёз з Слуцкай паўстанцкай Брыгады кандыдатаў у школу падхарунжых. Усе яны скончылі Слуцкую беларускую гімназію і штаб паўстанцкай Брыгады накіраваў іх пад маёю камандаю ў Беларускую Вайсковую Камісію дзеля адаслання ў школу падхарунжых у Варшаве, як другі беларускі з’вяз” (11).

Назаўтра юнакоў выправілі ў Варшаву, аднак хутка яны вярнуліся. Ротмістр Міранові паведаміў БВК, што камандзір школы палкоўнік Младзяноўскі адмовіўся прыняць новы беларускі з’вяз, спасылаючыся на загад Міністэрства вайсковых спраў. І толькі пасля хадайніцтва БВК і асабіста Ф.Кушаля перад Ю.Пілсудскім два беларускія аддзелы атрымалі дазвол прайсці курс навучання ў вайсковых школах. Кандыдатаў набіралі ў Мінскай і Нясвіжскай семінарыях, але ў асноўным сярод вучняў старэйшых класаў Слуцкай гімназіі і Слуцкага рэальнага вучылішча.

З паказанняў у ГПУ былого курсанта Піліпа Лемеша: “В 1920 г., когда пришли поляки, я не отступил с красными... Снова стал учиться. К нам в реальное училище пришел офицер Белорусской белой армии и предложил ехать в офицерскую школу, после его предложения начали записываться... Всех на автомобилях направили в город Барановичи, оттуда поездом в Варшаву, а потом в Лодзь... Там уже были те, кто поехал раньше...” (12). Лемеш быў як раз у той групе, якую сустракаў Ф.Кушаль.

“К нам в гимназию начали приходить офицеры и агитировать гимназистов поступать в офицерскую школу, - таксама вымушаны быў успомніць Андрэй Чыж, сын селяніна з вёскі Іграева, у 1920 годзе навучэнец 7-га класа Слуцкай гімназіі. - Многие начали записываться... Когда мы записались, то всех из города Слуцка отвезли на станцию Синявка на автомобилях. Было всего около 80 человек. Оттуда пошли в город Барановичи. В Барановичах посадили на поезд и направили в город Лодзь...” (13).

Па ўспамінах курсантаў, гэтым наборам моладзі ў вайсковую школу кіраваў Павел Якаўлевіч Жаўрыд, пляменнік якога Юліян Жаўрыд запісаўся ў школу адным з першых.

Пра тое, як праходзіў набор у мястэчку Семежава, вымушаны былі распавядаць следчаму ГПУ Кірыла Пратасевіч і Міхась Лушчыцкі. “В местечке Семежево формировалась балаховская армия (І Брыгада стральцоў БНР - Н.С.), а также БВК проводила набор в школу. Загодя появились объявления о наборе. Вербовал молодёжь капитан Борик. Те, кто имел четыре класса и более, начали записываться. Запись

проводилась в доме учителя Лущицкого. В м.Семежево были одни сутки. Всех принятых отправили в город Лодзь”. Былыя курсанты Лодзінскай школы сведчылі, што камісія запісвала не ўсіх жадаючых: “Есиповича и Трушко не приняли за недостатком образования (скончылі адзін клас гімназіі - Н.С.), и они остались в Белорусской армии”.

Дарэчы будзе заўважыць, што ў гэтых маладых случакоў быў выбар. Паводле ўспамінаў удзельнікаў падзей, адны запісваліся ў “міліцыю беларусаў”, другія - “у балахоўцы”, трэція - “у Семежаўскую армію” (Брыгаду БНР - Н.С.), чацвертыя - у асноўным найбольш адукаваная і патрыятычна настроеная частка моладзі - пажадалі надзець мундзір афіцэра арміі незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі. Прынамсі менавіта перспектыва самастойнай дэмакратычнай Беларускай дзяржавы, як дружна паказалі яны на следстве, і сабрала іх у Лодзі (14).

Іх не цікавіў разнабой думак сярод ваенных і палітычных настаўнікаў. І для Рады Случчыны, і для генерала Булак-Балаховіча, якія ніяк не знаходзілі агульнай мовы, неадкладнай задачай з’яўлялася фарміраванне нацыянальнага войска. У яго шэрагі імкнуліся маладыя людзі. Безумоўна, незалежнасць Бацькаўшчыны - гэта тая высакародная мэта, высокі пабуджальны матыў, які вызначыў учынкі і дзеянні юнакоў.

Былі абставіны і менш узнёслыя, але ў жыцці не менш істотныя. З паказанняў Кірылы Пратасевіча: “Поляки ночью оставили нашу местность, но красные ещё не пришли... Меня разбудил односельчанин и сказал: давай убегай, а то придут красные и нас расстреляют. В подтверждение сказал, что его свояк был в Слуцке и видел объявления о том, что расстреливают тех, кто не служил в Красной армии, как дезертиров. Уходить меня уговаривали соседи и мать Арциховича Хима...”. Аляксандр Маркевіч таксама зазначыў: “Я бы не пошел, но начали пугать, что товарищи расстреливают...” (15).

Страх перад нязванай, нежаданай уладай, інстынкт самазахавання вымушалі пакідаць роднае гняздоўе. Але не без жорсткага супраціўлення. Можна меркаваць па ўскосных “доказах”, што нашы героі ў сілу сваіх перакананняў, тэмпераменту, маладосці, нарэшце, не маглі застацца ўбаку ад галоўнай падзеі - Слуцкага паўстання. Гэтую “віну” з падследных прызнаў за сабой толькі Аляксандр Маркевіч, і то таму, што ў 1925 годзе быў судзімы за гэты “учынак” Вярхоўным судом БССР разам (далей цытата з матэрыялаў следства)

“с командиром Белого Белорусского полка Гавриловичем и Сергеенко, жителем города Слуцка, за военные действия против Советской власти в период 1920 года после заключения перемирия с поляками в нейтральной полосе”. Астатнія ж катэгарычна адмаўлялі свой удзел у паўстанні. Аднак расказ курсанта Івана Караффы-Корбута дае некаторыя падставы думаць пра адваротнае. З пратакола допыту: “После долгого запирательства и отказа, выдуманных легенд Караффа-Корбут показал, что “сын селяніна, але па саслоўі дваранін...” в Красную армию не пошел, был дезертиром, в 1919 году присоединился к Легии русских офицеров, где встретил немало земляков (усё тыя ж, слуцкія - Н.С.), после её разоружения сидел в польском лагере. Когда вернулся, то узнал от земляков, “что по мирному договору с Польшей местность перешла к красным... В Слуцке, Семежеве и других местах произошло восстание против красных, и там начала руководить Рада... Между красными и войсками повстанцев идут бои. Слуцк снова занят красными войсками, и они всех расстреливают, и ехать мне домой не советовали, а постановили ехать в Лодзь, куда после восстания забрали многих учащихся из Слуцка и района и посылают учиться в Лодзь в военную школу Булак-Балаховича”. Караффа-Корбут прыехаў у Лодзь, дзе “нашел военную комиссию, которая принимала в балаховскую офицерскую школу, предъявил документы, после чего был зачислен...” (16).

Па ўсім бачна, што гэты другі набор у школу праводзіўся на працягу кастрычніка - пачатку снежня 1920 года ў розных месцах - Слуцку і Слуцкім павеце, Мінску, Нясвіжы (пра гэта ёсць сведчанні мінскіх і нясвіжскіх семінарыстаў), Лодзі.

Пра тое, чаму і як вучылі ў Лодзінскай школе, успаміналі вельмі скупа: “абмундзіравалі, навучалі ваеннаму строю”. Школа мела аддзяленне, дзе выкладалі на беларускай мове, што для навучэнцаў было вельмі важна (“поступали в белорусскую балаховскую школу, в которую вербовала Белорусская Рада”), - гэта падкрэслівалі ўсе, удакладняючы тым самым, што не да палякаў ішлі на службу .

Аб гэтай школе ў Лодзі цікавыя ўспаміны пакінуў вядомы польскі пісьменнік Мар’ян Брандыс (17). Мар’яну было крыху больш за дзесяць гадоў, калі ў сакавіку ці красавіку 1920 года маёр Білік з камендатуры горада прывёў да іх (дом бацькоў М.Брандыса знаходзіўся ў Лодзі па вуліцы Пшеязд № 20 - Н.С.) на кватэру чужога афіцэра у круглай жорсткай фуражцы з карычневым скураным казырком, у карычнева-аліўкавым мундзіры, не падобным ні на адзін знаёмы яму польскі

мундзір. Маёр прадставіў: “Гэта не рускі, гэта - беларус, паручнік Сцяпан Савіцкі з добраахвотніцкай беларускай дывізіі генерала Булак-Балаховіча. Яны нашы саюзнікі і памагаюць біць бальшавікоў. Пасля сканчэння вайны яны хочуць стварыць Каралеўства Беларусі”. “Я ведаў,- распавядаў М.Брандыс, - што паручнік Сцяпан вучыў на невядомых мне пляцах ваеннай справе новых салдат каралеўства Беларусі.”

У паручніка быў самавар. Над ложкам вісела карта Еўропы, алоўкам была выдзелена тэрыторыя Беларусі. Малы Мар’ян карту кепска разумеў. Невядомае каралеўства Беларусь у яго думках месцілася за тымі дзвярыма, што вялі ў пакой паручніка Савіцкага. У шуфлядах стала Сцяпан хаваў форменныя гузікі, шнуры, крыжы на ланцужках, круглыя медалі, ордэнскія калодкі, бел-чырвона-белыя стужкі. Да Савіцкага ў госці прыходзілі беларускія афіцэры, часцяком спявалі песню “А хто там ідзе?..” Часцей за ўсіх прыходзіў капітан Коршук з сынам. Яны былі з-пад Баранавічаў, жонку Коршука забілі бальшавікі. Мар’ян запомніў, што гэты афіцэр да вайны быў загадчыкам школы ў сваёй вёсцы. Польскаму юнаку вельмі падабалася песня, што спявалі госці іх кватаранта:

Балахович-Булак
Атаман наш лихой,
Только слово скажи
Мы пойдем за тобой.

Мабілізаваная са Слуцка і павета моладзь ў Лодзі правучылася каля дзвюх месяцаў. У пачатку 1921 года курсантаў падзялілі на дзве групы. Асобы, якія мелі 6 класаў і больш, накіроўваліся ў Варшаўскую афіцэрскую школу, 4 класы - у Быдгашч. У Варшаўскай школе тэрмін навучання быў вызначаны ад паўгода да 8 месяцаў, у Быдгашчы - год, але потым прадоўжылі да палутара. У Варшаву паехала каля 30 чалавек, у Быдгашч - каля 20. Астатнія раз’ехаліся хто куды. Адны, нелегальна перайшоўшы мяжу, вярнуліся на радзіму, іншыя засталіся ў Польшчы, трэція - зноў далучыліся да паўстанцкага руху.

У Варшаўскай афіцэрскай школе вучыліся (не ўсе, праўда, яе закончылі) Кухто, Ліхадзіеўскі, Чыж, Шамяціла, Залесскі, Вечар-Шчарбовіч, Калядка, Бараноўскі, Шулякоўскі, Янкоўскі і іншыя. У Быдгашч тыдні на два-тры пазней паехалі Арціховіч, Пратасевіч, Лушчыцкі, Фядзюшка, Новік, Бачко, Караффа-Корбут і іншыя.

Наступныя падзеі не садзейнічалі ўздыму патрыятычных настрояў.

І ў Варшаве, і ў Быдгашчы навучалі на польскай мове, рыхтавалі па праграме польскіх кадэтаў, хоць беларусы і былі вылучаны ў асобны звяз. Курсантам выдалі новае абмундзіраванне ахоўнага колеру, на пагонах літары “О”, што азначала “школа афіцэраў”, і выява дубовага лістка з мечам. Пятліцы былі абшыты жоўтым кантам, на фуражцы - выява польскага белага арла. Так падрабязна апісаў па патрабаванні следчага свой мундзір курсанта Кірыла Пратасевіч, які, па ўласным прызнанні, доўга захоўваў фотаздымак слуцкіх хлопцаў, што навучаліся ў Быдгашчы. Калі пачаліся арышты, ён і іншыя, хто меў фотаздымкі, палічылі за лепшае знішчыць “рэчавы доказ” (18).

Савецкая Расія і Польшча здолелі дамовіцца. З інтарэсамі Беларусі, яе народа ніхто не лічыўся. Ненадзейнасць і незразумеласць перспектывы навучання случакі адчулі вельмі хутка. Праз паўгода рознымі шляхамі яны імкнуліся на радзіму.

У лістападзе 1921 года курсанты ў Быдгашчы былі прыведзены да прысягі, аднак беларусы праваслаўнага веравызнання прысягаць Польскай дзяржаве адмовіліся, пасля чаго з школы былі звольнены. Дарэчы, Рыгор Калядка, былы курсант Лодзінскай, потым Варшаўскай школы, які пасля вяртання на радзіму быў прызваны ў Чырвоную армію і прыведзены да прысягі 1 мая 1922 года ў Смаленску пасля заканчэння ваенна-інжынерных курсаў, адмовіўся прысягаць і саветам.

Ваеннае міністэрства Польшчы не перашкаджала і тым, хто хацеў пайсці раней. Выпраўлялі партыямі па 2-3 чалавекі. “Я попал в третью партию, - успамінаў Караффа-Корбут, - и был уволен вместе с Бачко и Лемешем в мае 1921 г., направились сразу в Лодзь. Однако там нашей части уже не было” (19).

Мясцовыя жыхары дапамагалі перайсці мяжу, дабрацца да дому. Многія з курсантаў, што вярнуліся ў БССР, у 1922-1924 гады былі асуджаны за нелегальны пераход граніцы, пераследаваліся як дэзерціры, адбывалі пакаранне ў турмах. Зноў перажылі мабілізацыю ў Чырвоную армію.

Пасля таго, як знялі ваенны мундзір (беларускі, польскі, савецкі), лёсы іх склаліся па-рознаму. Большасць не адрывалася ад зямлі, жыла на гаспадарцы. Некаторыя скончылі савецкія ВНУ, настаўнічалі, працавалі медыкамі, эканамістамі і г.д. Разам былі (не ўсе, вядома) сабраны зноў у сценах ГПУ Беларусі ў красавіку-маі 1929 года, дзе вымушаны былі ўспомніць недалёкае мінулае, высокія мары юнацтва, імкненне паслужыць незалежнай дэмакратычнай Бацькаўшчыне. Потым - стандартнае абвінавачванне ў шпіянажы на карысць

буржуазнай Польшчы і высылка на Салаўкі тэрмінам на тры гады. Далейшы лёс большасці з асуджаных не прасочваецца. Вядома толькі, што пасля адбывання пакарання ў Салавецкім лагеры (СЛАГу) на радзіму (ў Бабруйск) вярнуўся Язэп Сукала, у Новасібірскую вобласць на жыхарства быў сасланы Барыс Шамяціла. Мінчанка Ірына Аляксандраўна Маркевіч і сёння не можа адшукаць сляды свайго бацькі Аляксандра Маркевіча, таксама былога вязня СЛАГу. Звестак пра яго і іншых “падзельшчыкаў” Філімона Арціховіча пакуль няма.

Крыніцы. Заўвагі

1.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа “СВБ”. Па паказаннях Ул.Пракулевіча, П.Жаўрыда, П.Чайкі.

2.Там жа. Па матэрыялах крымінальных спраў А.Самусевіча, Ул.Пракулевіча, У.Дубіны.

3.Там жа. Крымінальная справа П.Бабарэкі.

4.БДА МЛіМ. Ф.3, воп.1, сп.56, а.157.

5.Архіў КДБ РБ. Па матэрыялах крымінальных справаў С.Бусла, П.Бабарэкі, Ул.Пракулевіча, Ю.Лістапада і інш.

6.Там жа.

7.Кушаль Ф. Падрэзаныя крылы. //Беларуская моладзь. - 1964. - № 22. - С.3.

8.Там жа. - С.4.

9.Там жа.

10.НА РБ. Ф.60. Воп.3. Сп.843. А.20.

11.Кушаль Ф. Падрэзаныя крылы //Беларуская моладзь. 1964. - № 22. - С.4.

12.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа Ф.Арціховіча, А.Маркевіча і інш.

13.Там жа.

14.Там жа.

15.Там жа.

16.Там жа. Крымінальная справа Ул.Караффы-Корбута.

17.Marian Brandys. Straznik Krolewskiego Grobu. - Iskry. - Warszawa, 1984.

18.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа К.Пратасевіча і інш.

19. Там жа. Крымінальная справа Ул.Караффы-Корбута.

VIII. Здраднік ці ахвяра абставін?

У гісторыі Слуцкага паўстання здрада Паўла Чайкі, камандзіра Слуцкага палка, факт даволі вядомы. Здрада - з’ява заўсёды прыкрая, якімі б матывы яе не выклікалі. Першы камандзір Слуцкага палка, чалавек, якому было даручана фарміраванне гэтай баявой адзінкі, - і здрадзіў! Чаму так адбылося? Наколькі справядлівыя гістарычныя ацэнкі гэтага ўчынку? Простая канстатацыя факту не задавальняе. Трэба аб’ектыўна прааналізаваць гэты выпадак і, галоўнае, у сувязі з падзеямі і абставінамі.

Высвятленне гісторыі лепш пачаць з трагічнага фіналу жыцця Паўла Чайкі. Сумны канец адлюстроўваюць наступныя дакументы: “Заключение от 7 января 1921 г. военследователя Особого отдела ВЧК при РВС 16-й армии (прозвішча следчага): виновен и расстрелять”.

“Выписка из заседания тройки особого отдела 16-й армии. 7 января 1921 г. П.Чайка обвиняется в измене Советской власти и организации белогвардейского полка. Приговаривается к высшей мере наказания. Начальник - Ольский” (Хутка Ян Ольскі зойме пасаду старшыні ЧК Беларусі - Н.С.).

Начальнику ОО 16-й армии. Рапорт.

Доношу, что согласно предписанию Вашего от 8 января с.г. и постановлению “тройки” Особотдела от 7 января с.г. о расстреле Чайки Павла Петровича, 31 года за преступления против Советской власти, последнее приведено в исполнение 9 января с.г. в 3 часа ночи. 9 января 1921г.” (1).

Вось як нечакана павярнуўся лёс. Здрадзіў адным, расстралялі іншыя, але за тое самае - за здраду. Справа “па абвінавачванню Чайкі Паўла Пятровіча ў службе ў арміі Слуцкай Беларускай Рады” (такую назву мае дакумент) змясцілася ўсяго на 18 аркушах. Час быў ваенны, следчыя ЧК шмат не пісалі. Але ж сёе-тое з жыцця Паўла Чайкі можна ўведаць; дарэчы, большая частка дакументаў напісана ім уласнаручна.

Нарадзіўся 21 чэрвеня 1889 года ў вёсцы Лютовічы Вызнянскай воласці Слуцкага павета. Сялянская сям’я з 6 чалавек мела ўсяго 12 дзесяцін зямлі. Тры з іх выдзелілі Паўлу, калі ён ажаніўся. У пошуках лепшай долі сям’я яшчэ да пачатку Першай сусветнай вайны апынулася на Далёкім Усходзе. У 1909 годзе Павел вытрымаў іспыты за 6 класаў гімназіі ва Уладзівастоку. Праз тры гады скончыў Іркуцкую вайсковую вучэльню. Да вайны служыў у Херсоне і Варонежы. У час Першай

сусветнай вайны афіцэр сувязі. За баявыя заслугі быў узнагароджаны ордэнамі 4-й і 3-й ступені Святой Ганны, 3-й ступені Станіслава і 4-й - Уладзіміра. Даслужыўся да чыну штабс-капітана. На фронце быў абраны членам салдацкага камітэта корпуса. Пасля развалу старой расійскай арміі вярнуўся дамоў, у Лютовічы, маючы пэўны багаж палітычных поглядаў (і , трэба дадаць, як і той бязладны час, даволі няўстойлівых і хаатычных). Чайка сведчыў, што належаў да партыі эсэраў, але напрыканцы 1918 года выйшаў з яе шэрагаў, аб чым паведаміў праз газету "Бядняк". Гэты крок можна зразумець. У той час ён служыў памочнікам Слуцкага ваеннага камісара (пры чырвоных), пачаў схіляцца да бальшавікоў. Тым не менш з прыходам палякаў у Чырвонай арміі не застаўся, а як большыня случакоў, дэзерціраваў. Следчаму свае паводзіны тлумачыў працяглай хваробай на тыф. Але гэтая прычына дэзерцірства знайшлася амаль ва ўсіх, хто не хацеў адступаць з Чырвонай арміяй. 19 лістапада 1920 года Павел Чайка быў мабілізаваны Слуцкай Радай. Па 27лістапада займаўся фарміраваннем палка. У Асобаддзеле ЧК Чайка сведчыў, што ў Брыгаду пайшоў не добраахвотна, а пад пагрозай быць інтэрніраваным у польскі лагер для ваеннапалонных. Ці быў ён шчырым, калі гаварыў гэта следчаму? Хутчэй за ўсё - шукаў падставы, каб змякчыць "віну".

Адразу пасля Слуцкага з'езду Чайка ўвайшоў у склад ваеннай тройкі (Жаўрыд, Анцыповіч, Чайка), якая мела задачу ў сціслыя тэрміны вырашыць пытанне аб стварэнні войска. Ці можна быць ініцыятарам і арганізатарам пад прымусам? Чэкісты і не паверылі, асудзілі за "арганізацыю белага войска".

Са справы вынікае, што ўсе абавязкі афіцэра Слуцкай Брыгады Павел Чайка выконваў добраахвотна і свядома. Намаганнямі Слуцкай Рады, арганізатараў войска і яго асабістымі сфарміраваўся Слуцкі полк. Справа ладзілася.

Але сутнасць адзінства ў Слуцкай Радзе, наяўнасць дзвюх плыняў - балахоўскай (паланафільскай) і эсэраўскай (незалежніцкай) - у кіраўніцтве паўстаннем, нават у штабе Брыгады, дзе большыню складалі афіцэры-балахоўцы, дэзарыентавала людзей, сеяла разгубленасць, выбівала грунт з-пад ног. Кожная з груповак прэтэндавала на вяршэнства. І тыя, і іншыя шукалі падставу, каб высветліць адносіны і пакончыць з хісткім двоеўладдзем.

На жаль, гэтая непрымірымая канфрантацыя вельмі адмоўна адбілася як на выніках паўстання, так і на лёсе асобных людзей.

Першымі рассячы вузел праблемных дачыненняў з эсэраўскай вярхушкай Слуцкай Рады паспрабавалі балахоўцы. Начальнік контрвыведкі паручнік А.Мірановіч затрымаў ліст камандзіра Слуцкага палка Паўла Чайкі да былога супрацоўніка і сябра, ваенкома Вызнянскай воласці Кастуся Кецкі, эсэра, дарэчы. На жаль, галоўны дакумент, ліст Чайкі, які б пацвердзіў яго віну ці зняў яе, не знойдзены. Наконт зместу ліста існуе некалькі версій.

Сам Чайка на допыце сведчыў, што меў мэту папярэдзіць Кецку аб велізарнай колькасці дэзерціраў з Бабруйскага, Слуцкага паветаў, якія цэлымі натоўпамі ўліваліся ў паўстанцкую Брыгаду. Галоўную прычыну гэтай з'явы Чайка бачыў у пагрозах арыштаў і расстрэлаў, якіх не шкадавалі чырвоныя камандзіры. І ён параіў былому сябру не пужаць людзей і не правакаваць такім чынам шматлікія ахвяры. У шчаслівы збег падзей, як баявы афіцэр, франтавік, ён не верыў.

Чайка быў незадаволены станам спраў у паўстанцкім штабе і палітычнымі гульнямі кіраўнікоў, прасіў у сябра парады і дапамогі. Такім чынам выказаўся аб змесце злашчаснага ліста Уладзімір Пракулевіч: "Я и Жаврид видели, как его повели в контрразведку. Последние слова, которые мы услышали, были: "Жаврид, спаси меня!"

Арыштаваны разлічваў на дапамогу Паўла Жаўрыда, ён спадзяваўся, што камісар Найвышэйшай Рады справядліва разбярэцца ў яго канфлікце з контрвыведкай (контрразведкай), гэтым неафіцыйным штабам Булак-Балаховіча ў Слуцку.

Рэч ў тым, што намаганнямі эсэраўскай часткі Рады Чайка атрымаў пасаду камандзіра Слуцкага палка насуперак жаданню іншага боку бачыць на гэтай пасадзе капітана А.Самусевіча. Дапамогі Чайка не дачакаўся. Жаўрыд у дзень арышту ад'ехаў у Варшаву па грошы. Пракулевіч, назіраючы ўзмацненне балахоўцаў, сабраў аднадумцаў на тайны сход. Пакуль абмяркоўвалі невыносны стан расколу і шляхі выйсця, Чайка пасля пяці дзён арышту, у ноч з 2 на 3 снежня 1920 года уцёк, дарэчы, з дапамогай афіцэра контрвыведкі Мірончыка, які паспачуваў былому камандзіру.

Трэба зазначыць, што ў Асобы аддзел ВЧК пры 16-й арміі Чайка трапіў 12 снежня. Дзе быў дзесяць дзён, што рабіў, на якім баку шукаў прытулку, невядома. (Яшчэ адна акалічнасць - справа па абвінавачванні асабістамі распачата толькі 27 снежня. Пятнаццаць дзён на яго не звярталі ўвагі. Цікава, чаму? Можа не ведалі, хто трапіў да іх?)

Тым часам выпадак з Чайкай дапамог эсэрам перахапіць

ініцыятыву. На сходзе па прапанове Пракулевіча вырашылі арыштаваць і судзіць камандзіра брыгады Анцыповіча, начальніка разведкі Мірановіча і яго памочніка Рэўта. Першага за тое, што “не мог трымаць лінію Рады”. Фармальнай зачэпкай для арышту двух іншых быў праступак Чайкі. Сход пастанавіў прызначыць на пасаду камандзіра брыгады Антона Сокал-Кутылоўскага. Контрвыведку ўзначаліў афіцэр Беларускай Вайсковай камісіі Янушэнка. 3 снежня правялі арышты, на наступны дзень судзілі. Анцыповіча разжалавалі ў шараговыя, Мірончыка і Рэўта знялі з пасадаў. Дарэчы, апошні таксама хутка трапіў у ЧК і быў расстраляны. Паўлюкевіч і Мацелі вымушаны былі падпарадкавацца Радзе. Тым больш што Пракулевіч, каб мець узброеную падтрымку, аддаў загад камандзіру батальёна А.Колпаку зняцца з пазіцыі і з атрадам у 80 чалавек прыбыць у Семежава, дзе разбіраліся з балахоўцамі. І гэта ў той час, калі праціўнік перамагаў.

Гісторыя здрады Паўла Чайкі - гэта толькі вонкавы бок падзеі. Няхай ускосна, але ў першую чаргу здрада хавалася ў бязглуздых амбіцыях і ўпартым нежаданні шукаць згоды, у непрадуманых паводзінах палітыкаў.

Крыніцы. Заўвагі

1. Раздзел VIII напісаны па матэрыялах крымінальнай справы Паўла Чайкі архіва КДБ РБ.

IX. На фронце

Пасля таго, як польскія вайсковыя аддзелы пакінулі Слуцк, ваенная стаўка была перанесена ў Семежава. У мястэчка прыбыла Рада. Адусюль сцякаліся людзі. Па даных Пракулевіча іх сабралася да 15 тысяч чалавек. Шмат адразу перайшло ў Польшчу.

Напрыканцы лістапада ў Семежаве з’явіліся член Найвышэйшай Рады К.Цярэшчанка, старшыня Беларускай Вайсковай Камісіі А.Якубецкі і штабс-капітан А.Борык. Правялі некалькі пасяджэнняў вузкім колам. Борык рашуча выступіў супраць дапамогі з боку Булак-Балаховіча. З прамовы Цярэшчанкі паўстанцы даведаліся, што не толькі ў Польшчы, але і ў шырокіх еўрапейскіх колах грамадства загаварылі аб паўстанцкім незалежніцкім руху ў Беларусі. Паўстанне павінна было прадэманстраваць рашучасць беларусаў дабіцца незалежнасці. “Мы хацелі, аднак, каб свет крыху падумаў аб нас. Чаму аб Літве, Латвіі, Польшчы клапоцяцца заходнія дзяржавы, а Беларусь пакідаюць сваёй долі?” Было запланавана стварыць для паўстанцаў друкарню. Польскія ўлады далі дазвол на адкрыццё яе ў Слоніме. Для працы туды быў накіраваны М.Касцевіч. Пакуль справы з друкарняй не вырашаліся, абмежаваліся гектографам. Выдалі прыгаданую дэкларацыю Рады, некалькі зваротаў да грамадзян, чырвонаармейцаў, сялян. Памножылі “Пагоню” Максіма Багдановіча, песню-гімн “Ад веку мы спалі” разам з нотамі. Мелі намер арганізаваць курсы беларусазнаўства (1).

На другі дзень госці прымалі парад беларускіх аддзелаў. Паўстанцы з бел-чырвона-белымі нашыўкамі замест пагонаў прайшлі з песнямі па плошчы. Цярэшчанка вельмі расчуліўся. Паўстанцы ішлі ў бой.

У канцы лістапада 1920 года Першы Слуцкі полк займаў участак ад Семежава да Вызны працягласцю прыкладна 20 кіламетраў. Баявыя дзеянні пачаліся 27 лістапада. Аддзелы 6-й роты Слуцкага палка на чале з падпаручнікам Кернажыцкім падчас разведкі ў раёне вёсак Быстрыца, Верамейчыкі, Васільчыцы і Чарнагубава сустрэліся з бальшавіцкім разведвальным атрадам. У выніку сутычкі захапілі палонных, ад якіх даведаліся аб размяшчэнні чырвоных. Працяглы бой завязаўся каля Васільчыц, бальшавіцкія атрады адышлі. Адзін са стральцоў быў цяжка паранены. Чырвонаармейцы згубілі трох забітых, трох параненых і адзін трапіў у палон.

Вёскі Лютовічы і Дашнава занялі пасля баёў аддзелы 5-й роты на

чале з падпаручнікам Клішэвічам. У палон узялі пяць чырвонаармейцаў. 7-я і 8-я роты змагаліся за вёску Мацкевічы. У напрамку Капыля занялі таксама вёску Цімкавічы (аддзелы Грозаўскага палка). Страты былі з абодвух бакоў.

30 лістапада вялі баі на ўсход ад Слуцку ў раёне вёскі Ужыца (Бабруйскі павет). Чырвоныя аддзелы ўпарта абаранялі падыходы да чыгункі, падцягнулі новыя сілы.

У Семежава тым часам ўсё прыбывалі ўцекачы, дэзерціры, ваеннапалонныя. Тых, хто паходзіў з беларускіх губерняў, не затрымлівалі, рэгістравалі і адпускалі. Частка з іх выконвала працу ў маёнтках, дзе ў асноўным паўстанцы бралі хлеб. Калі пачалося адступленне з Семежава, гэтыя людзі самі выстраіліся ў рады і пацягнуліся ўслед за адыходзячымі паўстанцамі.

Уцекачоў з расійскіх губерняў адпраўлялі ў польскія канцэнтрацыйныя лагеры згодна з дамовай з польскім ваенным кіраўніцтвам. Камуністаў, чырвоных камандзіраў, камісараў, як правіла, расстрэльвалі па рашэнні ваенна-палявога суда ці па загаду камандзіра брыгады. Васіль Русак сведчыў, што ўсяго расстралялі такім чынам 18 чалавек, у тым ліку членаў Вызнянскага рэўкома.

24 лістапада пачаўся запіс дабраахвотнікаў у Брыгаду. Між тым узмацніліся непаразуменні паміж Радай і штабам паўстанцаў. Ваенныя бачылі, што на матэрыяльную дапамогу Найвышэйшай Рады разлічваць не даводзіцца. Узрастала колькасць прыхільнікаў Булак-Балаховіча, армія якога да гэтага часу была ўжо інтэрнавана, але генерал меў неблагія матэрыяльныя магчымасці. На ваенныя нарады штаб пазбягаў запрашаць членаў Рады, ігнараваў камісара Найвышэйшай Рады. Для сувязі штаба Брыгады з Радай абралі Ю.Сасноўскага. Абвастрэнне адносінаў вылілася ў адкрыты канфлікт, закладнікамі якога былі камандзіры брыгады.

Камандаванне 16-й чырвонай арміі вырашыла ачысціць нейтральную зону ад паўстанцаў. 4 снежня з раніцы ў яе межы былі ўведзены часці 8-й і 17-й дывізій. Кіраўніцтва барацьбой з паўстанцамі было ўскладзена на Рэўваенсавет 16-й арміі з падначаленнем яму ўсіх атрадаў унутранай службы, губчэка, асобых аддзелаў і загарадзіцельных атрадаў. Пераадолеўшы ўпартае супраціўленне паўстанцкіх аддзелаў, чырвоныя занялі Вызну. 7 снежня пацяснілі паўстанцаў з Семежава (2).

Стаўка і Рада перабраліся ў Подчыцы. Вёска знаходзілася ў нейтральнай зоне, у дзвюх вярстах ад савецкай граніцы. Тым часам адчулі

недахоп харчу. Мясцовае насельніцтва не было такім шчодрым, як у Семежаве. Папрокі ў адрас Рады, што не змагла стварыць запасаў, узмацніліся. Канфлікт паміж штабам і членамі Рады - эсэрамі -паглыбляўся, што адмоўна адбівалася на ходзе баявых дзеянняў. У Подчыцах доўга не затрымаліся, зноў пераехалі ўглыб нейтральнай зоны. Наступным прыпынкам, дзе пратрымаліся да 15 снежня, былі Грыцэвічы. Становішча ўскладнялася. Людзей касіў тыф. Брыгада стала падобная на качэўніцкі лазарэт. Пры гэтым адчуваўся вялікі недахоп харчу і лекаў. Як успамінаў Ул.Пракулевіч: “Все мы, Жаврид, Якубецкий и я, крутились в поисках хлеба. Якубецкий вел переговоры с несвижским войтом об отпуске нам продуктов. Войт сначала спросил у варшавского руководства. Те отказали” (3).

Паўстанцы былі вымушаны пачаць рэквізіцыі ў насельніцтва. Войта за непадпарадкаванне і прыхаванне харчу і падводаў Грыцэвіч распарадзіўся пакараць 25-цю ўдарамі бізуна. Аднойчы аддзел паўстанцаў сутыкнуўся з абозам, які вёз у Польшчу прадукты. Як высветлілі, агенты польскага інтэнданцтва рэквізавалі іх у насельніцтва Слуцкага павета. Спасылаючыся на загад Рады № 1, які забараняў вываз прадуктаў са Случчыны, ваяры адабралі нарабаванае. Адбыўся вялікі скандал з мясцовай уладай. Умяшаліся жандары і мясцовы войт Чарноцкі, тым не менш прадукты не вярнулі.

На жаль, здараліся прыкрыя выпадкі рабаўніцтва мясцовага насельніцтва. Так, А.Мірановіч, адхілёны раней ад пасады начальніка контрвыведкі, атрымаў ад польскіх уладаў дазвол на фарміраванне коннага аддзела (партызанскага). Людзей ён сабраў выпадковых. Частка гэтага атрада ноччу напала на вёску Малыя Ражаны, абрабаваўшы сялян. Забралі грошы і 10 коней. Але суд Брыгады адрэагаваў адразу. Рабаўнікі былі жорстка пакараныя ў прысутнасці вяскоўцаў. Двух з іх - І.Мірончыка, які служыў у контрвыведцы Брыгады, і памочніка начальніка міліцыі (прозвішча невядома) - растралялі як ініцыятараў грабяжу. Астатнім прапанавалі заключэнне ў польскія турмы (была дамова Беларускай Вайсковай Камісіі, што асуджаныя судом Брыгады будуць адбываць тэрмін пакарання ў польскіх турмах за адсутнасцю ўласных) ці публічнае пакаранне бізунамі (25 удараў). Усе аддалі перавагу фізічнай экзекуцыі. І гледачам прадаставілася магчымасць назіраць незвычайнае відовішча ў польскім стылі (4).

Сутычкі з Чырвонай арміяй адбываліся ўвесь час. Звычайна гэта былі начныя налёты. 10 снежня быў учынены напад на вёскі

Крывасёлкі і Навасёлкі, у ноч на 12-е - на вёску Старынь. Паўстанцы паспрабавалі адцясніць часці Чырвонай арміі. 12 снежня яны занялі Семежава, пры гэтым захапілі вялікія запасы снарадаў. Прыклад мужнасці прадэманстравалі стральцы 2-й роты Слуцкага палка, якой камандаваў паручнік А.Курыловіч. 17 снежня зноў былі ў Вызне, 19 адступілі, 20 снежня вымушаны былі пакінуць Семежава (5).

Слабым месцам паўстанцаў была нястача зброі. Спачатку налічвалася ўсяго 300 карабінаў, якія былі перададзены польскімі ўладамі, і 500 вінтовак, якія прынеслі самі паўстанцы. Частка зброі была атрымана ад дэзерціраў або ўзята ў якасці трафеяў. Усяго ў снежні Брыгада мела ўжо 2000 вінтовак і 10 кулямётаў. Гэта было непараўнальна з добрым узбраеннем рэгулярных частак Чырвонай арміі. Нават шэсць браневікоў бралі ўдзел у наступленні на Слуцк. Удзельнік падзей успамінаў: “Без аружжа, без патронаў паўстанцы біліся, як львы. Роты паўстанцаў выходзілі на пазіцыі, маючы 30-40 стрэльбаў на роту, бо больш не было... пасланцы Брыгады прывезлі (ад Булак-Балаховіча - Н.С.) шмат аружжа і баявога снараджэння, але было ўжо позна” (6).

Па стратэгічных меркаваннях камандаванне вырашыла перанесці стаўку на Палессе, у вёску Морач, што знаходзілася таксама ў нейтральнай зоне ў адной вярсце ад савецкай граніцы.

17 снежня Найвышэйшая Рада распарадзілася аб прызначэнні Андрэя Якубецкага Галоўнакамандуючым войскамі БНР. Загад № 1 за яго подпісам заклікаў “весці барацьбу, пакуль беларус не стане гаспадаром на сваёй зямлі”, “да поўнага вызвалення Бацькаўшчыны ад захопнікаў”, “ад ярма чужых народаў” і г.д. (загад быў надрукаваны ў “Беларускім слове” ад 6 студзеня 1921 года).

Другі і апошні загад Якубецкага як Галоўнакамандуючага быў аб узнагародзе за баявыя заслугі афіцэраў Брыгады: Я.Залесскага, А.Курыловіча, А.Бранавіцкага, Я.Багушэвіча, А.Мірановіча, П.Яновіча, Я.Сямашкі, Н.Кернажыцкага, І.Копеца.

У Морачы высвятленне адносін працягвалася. Вёска блізка знаходзілася ад Лунінца, былой стаўкі Булак-Балаховіча. Тут заставаліся яго аддзелы і склады са зброяй і амуніцыяй. Ул.Пракулевіч даведаўся, што балахоўцы рыхтавалі захоп штаба Брыгады. У шпіталі А.Паўлюкевіча хаваўся брат генерала Язэп Булак-Балаховіч. Дайшлі чуткі, што С.Булак-Балаховіч і члены БПК вырашылі арыштаваць Пракулевіча, Жаўрыда і Якубецкага, абвінавачваючы іх у паражэнні.

Для арышту эсэраўскай часткі Рады з Лунінца выйшаў аддзел

Дзямідава ў колькасці 500 чалавек.

Але зводзіць рахункі ўжо не было часу. Часці паўстанцаў адступалі. З дня на дзень чырвоных чакалі ў нейтральнай зоне. Нехта прынёс навіну, што згодна з дамовай паміж Расіяй і Польшчай на Рыжскай канферэнцыі савецкія войскі атрымалі дазвол увайсці ў нейтральную зону на 77 гадзін “для ачысткі зоны ад бандытызму”, таму спяшаліся.

Адыходзілі ў Заастравечча, у вёску на беразе Лані, пакідаючы за сабою трупы рэўкомаўцаў, расстраляных у ноч адступлення. Гэта былі людзі не мясцовыя, яны прыйшлі здалёк, некаторы час уладарылі ў Вызне па загаду камандавання Чырвонай арміі.

У Заастравеччы сход афіцэраў выказаў недавер Радзе, абвінавачваючы ў здрадзе, адсутнасці дапамогі з боку ўраду БНР, няздольнасці забяспечыць паўстанцаў зброяй і харчам. Раду абвінавачвалі ва ўсіх няўдачах. Наступны і апошні прыпынак зрабілі ў Баранавічах. Тут чакалі прадстаўнікоў Найвышэйшай Рады. Перад ад’ездам з Заастравечча прыхавалі дзве скрыні ручных бомбаў, каб не засталіся балахоўцам, - тыя самастойна пачалі ўтвараць партызанскія аддзелы. Бомбы потым знойдуць чырвоныя і пакараюць вяскоўцаў.

Нарада ў Баранавічах, на якой прысутнічалі Цярэшчанка, Жаўрыд, Пракулевіч, Якубецкі, вырашыла ліквідаваць паўстанцкую акцыю. Жаўрыд паехаў далей у Варшаву, каб распрацаваць план ліквідацыі рэшткаў Брыгады і ўмовы інтэрнавання. Брыгада павінна была адначасова перайсці польскую мяжу і быць інтэрнавана як армія БНР.

У стаўцы гэта рашэнне не было падтрымана большай часткай афіцэраў, якія настойвалі на працягу барацьбы з чырвонымі шляхам стварэння нерэгулярных дыверсійных аддзелаў. Тым не менш пастанова аб ліквідаванні Брыгады была прынята. 28 снежня перайшлі мяжу і былі інтэрнаваны больш за 1,5 тысяч чалавек (па даных Ул.Пракулевіча). Рада Случыны знаходзілася ў Баранавічах яшчэ месяц. Ад яе імя ў студзені 1921 года была прынята рэзалюцыя, якая, падводзячы вынікі падзеі, канстатавала:

1. Польшча аніякай адчувальнай дапамогі паўстанцам не аказала, наадварот, чыніла перашкоды.

2. Адзіным правамоцным урадам прызнаецца ковенскі ўрад БНР, астатнія - урад Кнорына, Найвышэйшая Рада, Беларускі Палітычны камітэт на чале з В.Адамовічам - незаконныя.

3. Генерал Булак-Балаховіч не мае законнага і маральнага права

кіраваць беларускімі ваеннымі спалучэннямі, як самазванец і пагромшчык.

Гэтую пастанову Рады падтрымалі толькі 9 чалавек з 17. За апошнім подпісам - Івана Колпака - Пракулевічу прыйшлося ехаць у Нясвіж. Колпак збіраўся ўжо “дахаты”, як і бальшыня з паўстанцаў. Такім чынам і напрыканцы акцыі не была дасягнута згода і не было выпрацавана кампраміснае рашэнне.

Частка Слуцкай Брыгады (каля 400 чалавек) на чале з афіцэрамі засталася ў нейтральнай зоне для працягу ваенных дзеянняў партызанскага характару. Некаторыя атрады ўвайшлі ў склад “Зялёнага Дуба”, як, напрыклад, Паўла Бранавіцкага, Антона Самусевіча, Івана Мацэлі, Цімафея Хвядашчэні і інш. Барацьба працягвалася. Змянілася толькі форма супраціву. На змену паўстанцтву прыйшла антысавецкая партызанка і тэрор.

На беларускай нацыянальна-палітычнай нарадзе ў Празе 29 верасня 1921 года была прынята рэзалюцыя “Аб Слуцкім паўстанні”. Падзея характарызавалася як “нацыянальнае паўстанне за незалежнасць Беларусі”, “супраць Масквы” і “супраць Варшавы”.

К р ы н і ц а. З а ў в а г і

1. Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа “СВБ”. Паказанні Ул.Пракулевіча, П.Жаўрыда.

2.НА РБ. Ф.60, воп.3, сп.843, а.22.

3.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа “СВБ”. Паказанні Ул.Пракулевіча.

4.Там жа.

5.Там жа. Паказанні Я.Лапковіча-Корчыка.

6.Грамадзскі голас. - 1925, 10 снежня.

X. Інтэрнаваныя

Як засведчыў “камунікат штабу войск беларускіх”, 28 снежня 1 Слуцкая Брыгада стральцоў войск БНР спыніла бой (1). Пэўны час абяззброеныя польскімі ўладамі ваяры знаходзіліся ў м.Сіняўка, затым частка іх перадыслакавалася ў Вільню і увайшла ў Беларускі батальён войскаў генерала Желігоўскага. Камандаваў новай вайсковай адзінкай палкоўнік Гапановіч. Кіруючыя пасады ў батальёне занялі таксама афіцэры Брыгады. Першую роту ўзначаліў Сяргей Бусел. Камандзірам яшчэ адной стаў Антон Понтус. Беларускі батальён у Лодзі таксама папоўніла моладзь са Слуцкага палка (2). Але хутка, літаральна праз два месяцы і тыя, і іншыя апынуліся ў лагерах Беластоку і Брэст-Літоўска, 64 случакі склалі першую кампанію ў лагеры для інтэрнаваных у Драгагуску. З Лодзі частка адразу вярнулася дамоў.

Інтэрнаваных размясцілі ў лагеры, абнесеным у колькі радоў калючым дротам, пад дахамі кволых пабудоў - баракаў. Становішча ўчарашніх паўстанцаў не вельмі адрознівалася ад стану ваеннапалонных. Не дазвалялася выходзіць за межы лагеру. Паручнік Іван Шурпа, які выконваў абавязкі камандзіра з беларускага боку, нават намаляваў і распаўсюдзіў схему межаў. Усё жыццё сканцэнтравалася на невялічкай тэрыторыі паміж станцыяй Дарагуск, чыгункай і балотам. За дрот выходзіць было катэгарычна забаронена (3).

Да 20 красавіка 1921 года (да ліквідацыі кіраўніцтва кампаніі інтэрнаваных) усімі бакамі лагернага жыцця распараджаўся польскі бок. Толькі пасля згаданай даты каманда ўнутраным распарадкам перайшла да беларускага кіраўніцтва. Уся адказнасць за арганізацыю лагернага побыту была ўскладзена на камандзіра 1 Брыгады стральцоў войска БНР капітана А.Сокал-Кутылоўскага. Яго намеснікам быў прызначаны капітан Залесскі. На кожным вуглу ўжо не стаялі польскія вартавыя. Але палёгка была толькі ў межах лагера. Выхад за вароты дазваляўся пасля 9-й гадзіны вечара па спецыяльнаму дакументу (4). Жорстка каралі за самавольны сыход з лагеру. Дэзерціраў лавілі. Нават у пачатку траўня яшчэ гвалтоўна вярталі за дрот.

Першы загад па кампаніі інтэрнаваных за подпісам афіцэра БВК, камандзіра кампаніі Івана Шурпы з’явіўся 1 сакавіка 1921 года. Загады дарэчы, вызначалі ўсе бакі жыцця паўстанцаў “за дротам”. Штодзённа назначаліся дзяржурныя па лагеры і кухні.

§ 5 загада № 1 паведаміў аб раскладзе дня.

7 гадзін	- пабудка	12.00	- палудзень (абед)
7.00-7.30	- апрананне	12.00-15.00	- вольны час
7.30-8.00	- гімнастыка	15.00-17.00	- вучэнне
8.00-8.30	- снеданне	17.15-18.00	- прагулка
8.30-9.00	- прыгатаўленне да цвічэння	18.00-21.00	- вячэра і вольны час
9.00-12.00	- вучэнне	22.00	- класціся спаць (5).

За адсутнасць на вячэрняй праверцы чакала сур’ёзнае пакаранне. За парадкам сачылі дружыновыя, назначаныя загадам № 2 (4). Жаўнеры, што складалі першую кампанію, былі падзелены па тры дружыны. Першую ўзначаліў плютановы Самойлік, другую - сяржант Тамашынскі, трэцюю - жаўнер Ліхадзіеўскі.

Загады сведчаць аб строгім пакаранні за недысцыплінаванасць. “За неадданне ўстаноўленага гонару афіцэру караю 1 гадзінай карнага цьвічэння”, “За самавольны уход з муштры і за невыкананне загаду” - арышт на 3 дні. 9 сакавіка прыбыла новая група жаўнераў з Беластоку. 205 чалавек былі залічаны на ўсе віды давольства. З імі прыйшлі афіцэры 1-й Брыгады стральцоў БНР: капітаны Язэп Залесскі і Язэп Багушэвіч, паручнік Антон Крукоўскі, падпаручнікі Аляксандр Саваневіч і Сяргей Рогач.

Усе вайсковыя аддзелы, якія ўвайшлі ў склад кампаніі інтэрнаваных, захавалі свой ранейшы распарадак, свае аддзінкі і назвы. Польскім кіраўніцтвам было адразу зазначана, што “падафіцэры і жаўнеры не маюць а ні малейшага падабенства жаўнерскага выгляду”. Дысцыпліна і вайсковая муштра адсутнічае...”, “гамоняць сплошь па-расійску, што робіць надта дрэннае ўражанне” (6).

Для выпраўлення сітуацыі з дысцыплінай і лепшага прахаджэння вайсковай муштры ўсіх жаўнераў падзялілі на тры вучэбныя кампаніі, кампаніі на ўзводы, секцыі і г.д. Інструктарамі муштры былі назначаны сяржант Шчэнснік, плютановы Самойлік, капрал Сухоцкі, жаўнеры Варанецкі, Ліхадзіеўскі, Шчурко. Муштра адбывалася на вучэбным пляцы пад асабістым назіраннем І.Шурпы. Афіцэрам таксама было прапанавана “штодзень з”яўляцца на вучэбны пляц для вайсковае муштры”, прынятай у Беларускім войску. Хадзіць за снеданнем, абедам, вячэрай, а таксама на працу, вучэнні, у лазню кіраўніцтва патрабавала строем “у шыхту”, пад камандай.

Іван Шурпа клапаціўся паўсядзённа аб палітычным і маральным абліччы сваіх шараговых. Як мог вырашаў моўную праблему, у тым ліку і з дапамогай загадаў.

На камандныя пасады назначаліся толькі тыя, хто найлепш асвоіць вайсковую муштру Беларускага войска. Шараговым за добрые паводзіны і добрае веданне вайсковай службы давалі званне капрала (прыклад Васіля Варанецкага) (7).

Наладзіць гаспадарку было вельмі няпроста. Інтэрнаваныя скардзіліся на адсутнасць ежы, бялізны, вопраткі. Работа не аплочвалася. Не хапала неабходнага. Не было нават сталовай. Каб падтрымаць неабходны парадак, І.Шурпа патрабаваў харчавацца у бараках у адзін час і ўсім разам (8).

Інтэрнаваныя былі абмежаваны ў сваіх магчымасцях знайсці дадаткова прадукты харчавання. Існаваў спецыяльны загад, які забараняў лавіць рыбу. За яго парушэнне былі пакараны шараговыя Мошек Фельдман, Франек Мікіцюк, Якуб Лерух (9).

Не хаваючы задавальнення, савецкія газеты смакавалі цяжкасці побыту інтэрнаваных у польскіх лагерах. "Баракі драўляныя, напалову ўраслі ў зямлю, з дзюркамі ў сценах і столі. Даўжыня кожнага барака - у 30 крокаў, шырыня - 20 крокаў. Падлога ў большасці земляная. У некаторых бараках ёсць матрацы з саломы, у большасці - голыя нары. Норму паліва не даюць. У выніку - холад, хваробы, тыф" (10).

Хворых амаль штодзённа накіроўвалі ў "ізбу хворых" у суправаджэнні афіцэра. Шпіталь знаходзіўся ў Жырардаве. Дактароў у лагерах не хапала. Хворыя часта знаходзіліся побач са здаровымі. Камандзіры строга сачылі за чысцінёю, што ва ўмовах распаўсюджання тыфа і іншых інфекцыйных хваробаў было неабходнаю мераю. За бруд у бараках і на тэрыторыі лагера аб'яўляліся вымовы (11).

Уся нялёгкая гаспадарчая справа была ўскладзена на плечы так званага гаспадарчага афіцэра Беларускай брыгады падпаручніка Сямашкі.

Нягледзячы на ўмовы няволі і дрэнны побыт, культурнае жыццё не заціхала. Працавала бібліятэка, якую ўзначальваў Іван Маеўскі. У велікодныя святы (каталіцкія і праваслаўныя) ў Брыгадзе адбываліся багаслужэнні. Вучэбную каманду строілі на пляцы для віншаванняў. Пісьмова віталі жаўнераў старшыня БВК А.Якубецкі і сябра БВК Якабіні. Ладзіць вечарыны дапамагаў аддзел асветы БВК. З Васілём Русаком на чале падрыхтавалі і разыгралі на сцэне дзве

камедыі - “Міхалка” і “Па рэвізіі”. “Не маючы ніякіх крыніц, адкуль можна дастаць усё патрэбнае для сцэны, усе-такі зрабілі больш, чым можна было зрабіць, і паставілі спектакль у хораша дэкараванай ельнікамі і хвоямі залі”, - з захапленнем пісаў аб падзеях вечара велікоднага дня 17 красавіка невядомы карэспандэнт з ліку інтэрнаваных (12). Гасцямі беларускага вечара былі камандзір абозу, усе тутэйшыя польскія афіцэры з жонкамі і польскія жаўнеры, а таксама ў залі сабралася шмат цывільнай публікі, мясцовыя яўрэі і ўкраінцы. У спектаклях было занята амаль усё беларускае кіраўніцтва. У камедыі “Міхалка” ролю пана Карыты выканаў паручнік Шурпа, Міхалкі - жаўнер Самойлік. Удзячная публіка адзначыла добрае выкананне камедыі “Па рэвізіі” і акцёрскае майстэрства капітана Залесскага, паручніка Сямашкі, прадстаўніка БВК Русака.

Моцна ўзнялі настрой прысутных з густам выкананыя спевы і дэкламацыі. “Хор пад кіраўніцтвам спрактыкаванага рэгента паручніка Сямашкі выканаў некалькі беларускіх песень... а пасля былі прадэкламаваны панам Русаком і некаторымі інтэрнаванымі афіцэрамі вершы Я.Коласа, Я.Купалы і А.Гаруна, - паведаміў чытачам “Нашай Думкі” адзін з удзельнікаў вечарыны. Уся культурніцкая праца была прасякнута “шчырым каханнем усяго свайго роднага” і цвёрдым намерам прэзентаваць чужынцам “сваю мову, сваіх паэтаў, літаратуру” (13).

З 10 траўня пачаўся працэс афіцыйнага звальнення. Першымі на радзіму выправіліся Сцяпан Самойлік, Васіль Варанецкі, Алексей Сідарэвіч, Захар Шчурко. За імі паехалі ўжо дзесяткі случакоў. Тыя, што засталіся, уступалі ў арганізаваныя II аддзелам 4-й арміі генерала Скерскага работніцкія дружыны, якія займаліся самымі рознымі справамі, напрыклад, адбудовай мастоў і рамонтам дарог у прыфрантавой паласе. З найбольш надзейных і па-антыбальшавіцку настроеных асобаў ствараліся дыверсійныя групы, якія перакідваліся на бальшавіцкі бок з мэтаю падтрымання партызанска-паўстанцкай дзейнасці ў раёнах Слуцка і Бабруйска. Польскія ўлады лічылі, што яны маюць права арганізоўваць падобнага роду неканвенцыйныя акцыі, бо падобнымі метадамі ўжо здаўна карыстаўся савецкі бок, які высылаў дыверсійна-баявыя групы на тэрыторыі, кантраляваныя палякамі (14).

Пасля падпісання ў Рызе мірнага трактата паміж Польшчай і Савецкай Расіяй новая палітычная сітуацыя патрабавала вырашэння беларускай праблемы. Згодна з умовамі дагавора ніводзін з бакоў-

удзельнікаў не мог падтрымліваць на сваёй тэрыторыі дзеянняў, супярэчных інтарэсам іншага боку. Польскія палітычныя сілы націскалі на вайсковыя ўлады дзеля таго, каб тыя спынілі падтрымку беларускіх антыбальшавіцкіх акцыяў. У выніку Галоўнае кіраўніцтва Войска Польскага аддало камандзіру 4-й арміі загад распусціць усе беларускія арганізацыі па абшарах дзеяння яго арміі. Усе дыверсійныя групы меліся быць разброенымі, а работніцкія дружыны - распушчанымі. Іх удзельнікаў рэкамендавалася ў меру магчымасці выслаць за межы Польшчы (15), што і было зроблена. Такім чынам яны апынуліся на шляху ў ГУЛАГ.

К р ы н і ц ы. За ў в а г і

1.БДА МЛіМ. Ф.3, воп.1, сп.158, а.66.
2.Архіў КДБ РБ. Крымінальная справа С.Бусла.
3.БДА МЛіМ. Ф.3, воп.1, сп.165, а.4, 4 аб.
4.Там жа. А.41.
5.Там жа. А.6.
6.Там жа. А.12.
7.Там жа. А.13, 16.
8.Там жа. А.8.
9.Там жа. Сп.164, а.3.
10. “Савецкая Беларусь”, 4 лютага 1921 года.
11.БДА МЛіМ. Ф.3, воп.1, сп.   , а.6.
12.“Наша Думка”, 6 траўня 1921 г.
13.Там жа.
14.Збігнеў Карпус, Вальдэмар Рэзмер. Слуцкае паўстанне 1920 г. у святле польскіх вайсковых матэрыялаў //Наша слова. - 1996. - № 45. - С.4.
15.Там жа.